ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# «Ад літаратурных радкоў – да сэрцаў чытачоў»

***Зборнік сцэнарных матэрыялаў да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў 2017 года***

Кобрын, 2016

ББК 78.374.3
Ад 28

Ад літаратурных радкоў – да сэрцаў чытачоў : зборнік сцэнарных матэрыялаў да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў 2017 года / ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. М. Міхейкіна-Белякова. - Кобрын : - 2016. – 92 с.

У зборнік увайшлі сцэнарыі да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў 2017 года (Я. Коласа, Я. Купалы, П. Панчанкі, М. Танка). Пры складанні зборніка выкарыстаны сцэнарныя матэрыялы з часопісаў “Бібліятэка прапануе”, “Роднае слова” і “Народная асвета”.

Дадзенае выданне прызначана ў дапамогу супрацоўнікам публічных бібліятэк, настаўнікам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў правядзенні мерапрыемстваў літаратурнай тэматыкі.

Склад.: А. М. Міхейкіна-Белякова

© ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

## ЗМЕСТ


- Сцэнарыі па творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа
  - “НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА”
    літаратурна-музычная вечарына ________________________ С. 4 – 10
  - “СНЯЦЦА СНЫ АБ БЕЛАРУСІ…”
    літаратурна музычная кампазіцыя ______________________С. 11 – 15
  - ЯНКА КУПАЛА І ЯКУБ КОЛАС
    віктарына для старэйшых класаў _______________________С. 16 – 23
  - “І СЁННЯ З НАМІ КОЛАС І КУПАЛА”
    літаратурная гасцёўня _______________________________С. 24 – 29
  - “ЁН І СЁННЯ З НАМІ, НАШ КУПАЛА”
    літаратурная вечарына ______________________________ С. 30 – 35
  - “НА КОЖНАЙ СЦЯЖЫНЦЫ ІХ ПЕСНЯ І ГОЛАС…”
    літаратурна-музычная вечарына _______________________ С. 36 – 46
- Сцэнарыі па творчасці Максіма Танка
  - НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКІХ ЗМЕН
    літаратурна-музычная кампазіцыя _____________________ С. 47 – 52
  - “Я СЭРЦАМ ПІСАЎ СВАЮ КОЖНУЮ ПЕСНЮ
    літаратурна-музычная імпрэза_________________________ С. 53 – 66
- Сцэнарыі па творчасці Пімена Панчанкі
  - КАБ КОЖНЫ ПАНЧАНКУ ПАЧУЎ
    вусны часопіс ______________________________________ С. 67 – 74
  - “АБ ЖЫЦЦІ, АБ ЛЮДЗЯХ, АБ САБЕ”
    вусны часопіс ______________________________________ С. 75 – 80
  - “ПАЭТЫЧНАЯ СПОВЕДЗЬ СУМЛЕННЯ”
    вечар паэзіі да юбілею з дня нараджэння Пімена Панчанкі__ С. 81 – 91

# Сцэнарыі па творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа





## НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

*Літаратурна-музычная вечарына*

*Касцючкова, І. С. Нам засталася спадчына : літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная Я. Купале і Я. Коласу / І. С. Касцючкова // Бібліятэка прапануе. – 2007. - № 2. – С. 16-19.*

І кожны, прамовіўшы – Колас Якуб,
Адразу ж прыпомніць; Янка Купала.
*Тэрэнь Масэнька*

*Ціха гучыць мелодыя песні «Спадчына»*

***1 - шы чытач***. І народ свята захоўвае
Ў сваім сэрцы памяць
Аб лепшым сваім сыне, які
Прайшоў разам з ім слаўны
Шлях барацьбы ў імя лепшых
Чалавечых ідэалаў.
***2 - гі чытач***. Жыві, мілы Колас,
Многа летаў, зімаў
З ясным сонцам побач
На зямлі радзімай.
*Янка Купала пра Якуба Коласа.*

**Першы вядучы**. Імкліва бягуць гады. Але колькі б часу ні прайшло, заўсёды будуць жыць у памяці людзей Купала і Колас - выдатныя народныя паэты, без яіх немагчыма ўявіць сабе беларускую літаратуру.

**Другі вядучы**. Яны пранеслі праз усё жыццё высокія ідэалы гуманізму, дабра і справядлівасці, аддалі народу свой талент, сваю душу і сэрца. Іх імёны вымаўляюцца заўсёды разам. Іх псеўданімы - з народнага жыцця і фальклору.

**Першы вядучы**. Наша літаратура - наш гонар, тая галіна духоўнай дзейнасці, у якой беларусы найболып ярка праявілі сябе як нацыя. Купала і

Колас раскрылі працоўнага чалавека, паказалі яго характар, выказалі думы і спадзяванні, адвечную прагу «людзьмі звацца».

**Другі вядучы**. Яны нарадзіліся ў адзін год. I мэту выбралі для сябе адну. I ўсё жыццё аддана служылі ёй. Можа пагэтаму яны вельмі блізкія па сваіх эстэ- тычных поглядах, грамадскіх ідэалах.

**Першы вядучы**. Але ж Купала і Колас вельмі розныя па творчай манеры, у кожнага свой голас, стылы свой непаўторны жыццёвы шлях, чалавечы характар:

**Другі вядучы**. Купалу мы ведаем як паэта і драматурга, аўтара цудоўных п’ес «Паўлінка», «Раскіданае гняздо». Паэт ён лірычна-ўзнёслы і рамантычны, па- рывісты, эмацыянальны, драматычны па прыродзе свайго таленту. Яго паэзія вастраканфліктная.

**Першы вядучы**. Янка Купала - непаўторны талент, у якім увасабляецца сіла беларускага народа, прыгажосць яго духоўнага багацця, яго глыбокая гуманнасць, яго мудрая філасофія. Купалава творчасць – цудоўна-непаўторнае люстра, у якім праўдзіва, ярка, хвалююча адбілася шматграннасць жыцця і барацьбы беларускага народа за сваю гісторыю, за чалавечыя правы.

Пісаць аб народзе, па-народнаму і для народа - такі дэвіз Купалы на ўсіх этапах творчасці. Здаецца, і ведаеш творы паэта, а ўсё роўна кожны раз, калі разгор- тваеш яго кнігу і пачынаеш чытаць, - адкрываеш для сябе штосьці новае, нязведанае.

**Другі вядучы**. Друг і паплечнік Янкі Купалы - Якуб Колас - паэт, празаік, драматург, крытык, дзіцячы пісьменнік. Неацэнная роля Коласа як заснавальніка рэалістычнай прозы. Ён выдатны майстра апавядання, аўтар празрыстых па мове і стылю аповесцей. Якуб Колас заклаў асновы беларускага рамана. Як пісьменнік-педагог, настаўнік па прафесіі, ён шмат зрабіў у галіне педагагічнай літаратуры.

Кнігі Якуба Коласа - удумлівы летапіс настрояў і імкненняў людзей, гістарычных падзей.

**Першы вядучы**. Яны напісаны рукой назіральнага і мудрага сучасніка, які заўсёды дбаў аб захаванні праўды жыцця аднаго чалавека і праўды жыцця народа. Аповесці, апавяданні, паэмы, вершы, казкі, п’есы, публіцыстычныя і літаратурна-крытычныя артыкулы пісьменніка ўзбагачаюць нас вопытам і ведамі ўважлівага даследчыка чалавечай душы, натхнёнага песняра роднай прыроды, гарачага патрыёта. Яны вучаць шанаваць і берагчы родную зямлю, родную мову, родную культуру.

**Другі вядучы**. Якуб Колас больш эпічны, болын зямны, чым Купала. Ён - выдашы апавядальнік, вельмі назіральны, уважлівы да адценняў думкі, да пачуццяў героя, знаўца самых разнастайных прыёмаў і спосабаў раскрыцця яго ўнутранага свету. Пісьменнік бачыў жыццё ў яго няспынным руху, заўсёды ў дарозе, у творчым пошуку.

Жыццё ж так казачна-імкліва,
Паспець за ім так цяжка мне,

Каб на шырокім палатне
Нарысаваць яго завівы,
Адбіць і хвалі пераліўы
На самай страшнай вышыне.

**Першы вядучы**. Якуб Колас быў бы вялікім паэтам, калі б стварыў толькі адну «Новую зямлю», якую называюць энцыклапедыяй сялянскага жыцця.

**Другі вядучы**. Паэтычна натхнёная купалаўская песня ўпершыню прагучала ў 1905 г. У прагрэсіўнай мінскай газеце «Северо-Западный край» быў апублікаваны верш «Мужык».

**Першы вядучы**. Дэбют Якуба Коласа адбыўся ў 1906 г. У газеце «Наша доля» быў надрукаваны «Наш родны край».

Так два волаты беларускага мастацкага слова «адкрылі» на ўвесь свет беларускі народ.

**Другі вядучы**. Пра жыццё і творчасць Я. Купалы і Я. Коласа напісана нямала навуковых даследаванняў, артыкулаў кніг. Вобразы славутых беларусіх песняроў хвалююць празаікаў і драматургаў. Але першынство тут належыць паэзіі.

**Першы вядучы**. Многія нашы паэты лічаць сябе вучнямі Янкі Купалы і Якуба Коласа, выказваюць удзячнасць за песні, што натхнілі іх, за дапамогу.

***1 - шы чытач***. Мы з імі выходзілі заўжды ў дарогу,
А як акрыляла нас іхняе слова,
Што сказана простаю,
Матчынай мовай,
Мы з вамі адолелі буры і хвалі...
Купала і Колас, вы нас гадавалі!
(П. Броўка. Купала і Колас, вы нас гадавалі..., урывак)

***2- гі чытач***. Ты для патомкаў у жыцці
Вялікіх спраў зрабіў нямала.
Жывым табе ў вякі ісці
З сваім народам, наш Купала...
(А. Астрэйка)

***3 - ці чытач***. Два каласы - дзве праўдзівыя песні!
Поплеч, як сёстры, ідуць у свет...
Колькі вы радасці людзям прынеслі,
Колас жытнёвы і Колас - паэт!
(Р. Тармола)

***1 - шы чытач***. Твой сад густы, а ён расцвіў, высокі,
Там шум паэм, дзівосных песень сказ...
Я піў не раз іскрыстыя іх сокі,
З крыніц тваіх напіўся я не раз.
Хай сад квітнее ў радаснай краіне,
Ягоны шум prасторамі звініць...
І доўга будзеш ты пад небам сінім

Ісці, спяваць, паэт, і жыць, і жыць!

***2 - гі чытач***. Проста і шчыра спяваў ён заўсёды,
Людзям у сэрцы песня запала –
Навекі зрадніўся з песняй народа
Сам творца песень - Янка Купала.

(А. Пракоф'еў)

***3 - ці чытач***. Шмат слоў гарачых я ў душы знайду,
Каб прывітаць цябе, любімы Колас...
Радзіма несла гора і бяду,
Калі над ёю прагучаў твой голас.
Цяпер з нас кожны - волі уладар.
Сям'ёй прыйшлі мы прывітаць паэта,
Якога песні - дзіўны сэрца дар –
Лунаюць вольна над шырокім светам.
Вітаем словам радасным таго,
Чыё імя Радзіма ўшанавала, -
Сяўца, што сеяў праўду з году ў год,
Каб век яна квітнела-расцвітала.

(К. Буйло)

**Другі вядучы.** Прыцягваюць увагу і ўзаемапрысвячэнні, поўныя шчырай сяброўскай любові.

Упершыню Я. Купала і Я. Колас сустрэліся летам 1912 г. Гэта адбылося на хутары Смольня, ваколіцы вёскі Мікалаеўшчына, цяперашняга Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці.

**Першы вядучы.** Якуб Колас пісаў у 1945 г.: «Янка Купала! Два словы, простыя беларускія словы, а колькі выклікаюць яны ў нашых пачуццях, уяўленнях успамінаў, перажыванняў, звязаных з творчасцю, з яркім вобразам вялікага паэта! У познюю восень 1907 года я жыў у Вільні і працаваў у рэдакцыі газеты "Наша ніва". Сярод вершаў карэспандэнцый і пісьмаў, дасланых рознымі аўтарамі, трапіўся аднойчы і верш Я. Купалы. Пад вершам стаяў подпіс "Янук Купала". Гэта імя і было маім першым літаратурным знаёмствам з Я. Купалам».

**Другі вядучы.** Янка Купала знаходзіў цёплыя, сардэчныя словы, каб выказаць захапленне светлым талентам Коласа, альбо ўзнавіць першую сустрэчу з ім у сялянскай хаце над Нёманам, сустрэчу, якая паклала пачатак іх шчырай дружбе:

Ты помніш, помніш, Колас мілы,
Як я к табе ішоў у госці...

**Першы вядучы.** Нашых народных песняроў славяць паэты на розных мовах свету.

***1 - шы чытач***. Між вуліц ташкенцкіх,
шырокіх і вузкіх,
Адной даў імя і пясняр беларускі.
Прайдзі па зялёнай алеі, якую

Узбекі-браты прысвяцілі Якубу!
(Сцяпан Ліхадзіеўскі, Узбекістан)
***2 - гі чытач.*** Прымі маю падзяку, шчодры лёс,
Што ты прывёў мяне з канца Еўропы
У гэты засень ніцых вербалоз
З настоем агурочніку і кропу,
Што тут, над ціхай Вязынкай-ракой,
Нібы яго дыханне чуўшы зблізку,
Я скалыхнуў удзячнаю рукой,
Далёкі пілігрым, яго калыску.
(Уолтэр Мэй, Англія)

***3 – ці чытач.*** Хто быў цяплом вачэй яго сагрэты,
Той не забудзе іхняй цеплыні;
Ён вораг быў няпраўды і маны,
Ён рыцар быў высакароднай мэты.
Ён мовы беларускае алмаз
Граніў замілавана і рупліва,
Братам-народам паказаўшы дзіва,
Як паказаў калісь Шаўчэнка ў нас.
Ён навучыў нас шанаваць глыбока
Святыню працавітае рукі, -
І ўвайшоў наш Янка ў вякі,
Як вобраз Беларусі яснавокай.
(Максім Рыльскі, Украіна)

***1 - шы чытач.*** В это утро по цветам и травам
Шёл июнь с жалейкой спозаранку,
Птиц будил по рощам и дубравам...
В этот день на свет родился Янка.
И когда над лесом солнце встало,
Заглянуло в низенькую хату:
«Будь ты, Янка, - ласково сказало, -
Сердцем чистым, разумом богатым!»
Ветерок влетел, рассветный вестник,
Запах трав принёс из-за дороги:
Выйдешь, Янка, на дорогу песни,
Будь же ты, как ветер, быстроногим!
Мать, склоняясь, напевала тихо:
«Спи, соколик! В жизни много лиха,
Будешь петь о Беларуси горькой,
Чтоб она, как солнце, светлой стала...»
А кукушка в роще за пригорком:
«Спи, соколик!» - звонко куковала.

День вставал погожий, синий-синий,
Вышло стадо в поле спозаранку,
Тёплый пар тянулся по низине...
В этот день на свет родился Янка.
(Мікалай Браун, Расія)

***2 - гі чытач.*** Вижу слов купаловских зарево
И «Левониху» озорную,
Волны Немана лучезарного,
Скатерть синих полей
Льняную.
Мне Якуба Коласа строки –
Словно матери вздох глубокий.
Белоруссия,
Свет мой синий,
Васильковый, неугасимый, -
Я страды твоей
Не забыла,
Гнев твой праведный –
Всё, что было.
Партизанской клятвы скрижали
У меня на сердце лежали.
(Марыя Камісарава, Расія)

***3 - ці чытач.*** Крыша темнеет намокшею дранкой.
Низкое небо на крышу упало.
Люди идут и идут спозаранку
В дом, где родился Янка Купала.
Болью рожденное в давние лета,
Скромное слово мне в сердце запало:
«Ждали давно белорусы поэта,
Пусть же им будет Янка Купала».
Снова сюда прихожу я усталым,
Только вздохну - и усталость пропала.
Стала родная земля пьедесталом
Дому, в котором родился Купала.
(Леанід Хаустаў, Расія)
*Гучыць песня «Янка Купала».*

**Першы вядучы.** Высока цанілі творчасць беларускіх песняроў і нашы знакамітыя касманаўты П. Клімук і Ул. Кавалёнак. Яны гаварылі, што купалаўскія словы не раз успаміналіся ім у касмічных прасторах: «Мой мілы таварыш, мой лётчык, вазьмі ты з сабою мяне...».

**Другі вядучы.** Прызнаннем сусветнага значэння беларускай літаратуры з’яўляецца і той факт, што помнік аднаму з самых нацыянальных нашых паэтаў - Янку Купалу - устаноўлены побач з помнікамі Пушкіну, Шаўчэнку, Уітмену ў Ароў-парку пад Нью-Йоркам. А ў 2006 г. у Маскве на Кутузаўскім праспекце быў таксама ўстаноўлены помнік Янку Купалу.

**Першы вядучы.** У 1982 г. па рашэнню ЮНЕСКА шырока, у міжнародным маштабе, адзначалася стагоддзе класікаў беларускай літаратуры, творы якіх узбагацілі многанацыянальную літаратуру, сталі сусветна вядомымі.

**Другі вядучы.** У 1996 г. створаны Міжнародны фонд Я. Купалы і Я. Коласа. 2007 г. у Беларусі аб’яўлены годам слова Я. Купалы і Я. Коласа.

**Першы вядучы.** Янка Купала і Якуб Колас вечна будуць жыць у сэрцы нарадзіўшага іх народа.

**Другі вядучы.** Жыве і будзе жыць сонечная песня Купалы і Коласа.

*Ціха гучыць мелодыя песні «Спадчына».*

***1 - шы чытач.*** Верны будзь слову,
Якім Купала,
Прарок народны,
Сэрцы ўзварушыў.
Верны будзь слову,
Якое ў полі
З матчыных вуснаў,
Як з неба, у душу.
(Л. Геніюш)

***2 - гі чытач.*** Ён з імем нівы нашай паўстае -
Нястомны сейбіт, ад каго пачуты,
І боль, і гнеў, і радасці яе
На свеце ўсюды.
Яго заўжды край родны будзе сніць –
У подзвігу яго натхнёнай музы
Ёсць вера наша горда гаварыць:
Мы - беларусы!..
(А. Русецкі)

***3 - ці чытач.*** І покуль жыць будуць людзі,
Покуль сонца будзе ўсходзіць,
Жыць Купалы песня будзе
І імя яго ў народзе.
(А. Бачыла)

*Гучыць песня «Спадчына».*

# “СНЯЦЦА СНЫ АБ БЕЛАРУСІ...”

*Літаратурна-музычная кампазіцыя*

*Клябанаў Д. “І сняцца сны аб Беларусі...” : літаратурна-музычная кампазіцыя, прысвечаная Я. Купале / Д. Клябанаў, В. Скіба // Роднае слова. – 2007. - №12. – С. 60 - 61.*

*Гучыць прыгожая музыка (цымбалы), вучні-акцёры выходзяць па чарзе на сцэну, у руках трымаюць запаленыя свечкі, сядаюць у крэслы, расстаўленыя ў шахматным парадку на сцэне, музыка сціхае.*

**Вядучы 1-ы.** Янка Купала... Для кожнага жыхара нашае сінявокае Беларусі гэтае імя гучыць неяк па-асабліваму, надзвычай меладычна, песціць слых і абуджае ўспаміны-летуценні.

Успаміны гэтыя няўлоўныя, лёгкія, як сон на світанні, як апошняя зорка-знічка ў ранішнім небе. Як буслаў клёкат на старой разгалістай ліпе, што стаіць пасярэдзіне жытнёвага поля. Як булькатанне сцюдзёнай крыніцы ў зацені дрэў. Як белае покрыва туману на пагорках і ўзлесках.

**Вядучы 2-і.** Янка Купала... Гэта папараць-кветка, што ўзрасла на нашай зямлі, што заззяла незвычайным бляскам, шчодра адорваючы занядбаны край цеплынёю, святлом, любоўю і пяшчотаю.

У народзе кажуць: раз на год, у ноч на Івана Купалу, расцвітае ў гушчары незвычайная, чарадзейная папараць-кветка. Хто знойдзе яе, заўсёды будзе шчаслівы. Кветка гэтая ўзышла, яе промні асвятлілі беларускую душу. Гэта Янка Купала.

Галоўным жаданнем яго было агарнуць родны край любоўю і шанаваннем, даць надзею знявераным, прытуліць занядбаных, абагрэць пакрыўджаных. Каб распраміліся плечы, заіскрыліся вочы, каб моцна забіліся сэрцы, каб загучала песня...

***Чытальнік 1-ы*** (дэкламуе пад музыку).

Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні,
Хоць ты выгані, пан, з хаты, -
Буду пець я свае песні
Ці то ў будні, ці то ў святы!
Думкі, оды пець я буду,
Каб усякі весяліўся,
Каб для гэтага тут люду
Свет інакшы адчыніўся!
Каб на полі ці на лузе,
Ці працуючы ля дому,

Ці у лесе, ці пры плузе
Пеў ён песні па-сваёму!
Каб ніколі не чураўся
Сваёй родненькае мовы,
У якой узгадаваўся,
Хоць забыўся дзеля новай.
Дык пець буду табе, людзе,
Каб працёр свае ты вочы! –
А шмат лепей табе будзе,
Як адрозніш дзень ад ночы.

**Вядучы 1-ы.** У Яся Луцэвіча, як і ў кожнага чалавека на гэтым свеце, пачыналася ўсё з дня нараджэння, але Вязынкі ды невялічкай хаткі над рачулкай Ясь зусім не памятаў. Дык калі яго, Ясева, сапраўднае жыццё пачалося? Можа тады, калі ўпершыню пачуў гучанне свайго верша з вуснаў выдаўца-рэдактара газеты "Северо-Западный край"? А можа тады, калі апякла яго думка: "Мне трэба быць Купалам, мне трэба знайсці купальскую кветку шчасця. Я той, каму шукаць яе, - для сябе, для мужыка".

**Вядучы 2-і.** Маці ўздыхала: "Дзеткі, дзеткі, і захацелася табе гэтага лёгкага хлеба". І гучыць у вуснах маці асуджэнне. А вось ужо надрукаваны верш "Мужык" поруч з апавяданнем "Тры сыны" Льва Талстога. Больш віднага месца ў газеце, чым поруч са славутым пісьменнікам, не было. Вось і няма ўжо Яся, няма Івана Дамінікавіча Луцэвіча. Затое ёсць паэт Янка Купала.

Яго душа не магла без кнігі, не магла без радкоў, што станавіліся строфамі, вершамі. А праца на бровары - неспакой, клопат, бегатня. Потым Янка Купала напісаў: "Зазнаў там такога пекла, якога яшчэ не меў". Універсітэтам Янкі Купалы было само жыццё.

***Чытальнік 2-і*** (дэкламуе пад ціхую музыку некалькі строфаў верша "Мая навука'').

**Вядучы 1-ы.** Любоў узвялічвае сэрца, робіць яго чулым, спагадлівым. Каханне нясе не толькі замілаванне, але і смутак, боль... Немагчыма любіць, не ўмеючы кахаць...

***Чытальнік 3-і*** (дэкламуе пад музыку).
Не глядзі на мяне, не глядзі, адыдзі,
Не чаруй так сабой і наяве і ў сне!
Ты смяешся з мяне... Дык ідзі ж, не глядзі,
Бо замучыш, загубіш навекі мяне!
Погляд вочай тваіх душу змучыў маю, -
Праз яго я сябе не змагу аніяк:
То я рвуся к табе, то, як слуп той, стаю,
То жалею цябе, то кляну горка так.
Дык ідзі, не глядзі! Я баюся цябе;
Не мая ты цяпер і не будзеш маей.
Дык ідзі, бо загубіш мяне і сябе,

Бо кіпіць мая кроў, сэрца рвецца з грудзей!

***Чытальнік 1-ы*** (дэкламуе пад музыку).
Гэткім шчырым каханнем яе атуліў,
З гэткай ласкай глядзеў ў яе сумныя вочы, -
Як і сонца не туліць расквечаных ніў,
Як і зоры людзям не ўглядаюцца ўночы!
Так пясціў, так галубіў галубку, яе,
Так цяпліў сваім сэрцам сірочым ёй грудзі, -
Як і маці не песціць дзіцё - як спаўе,
Як і вогнішча ззябнутых грэці не будзе!
Столькі песень над песнямі ёй я напеў,
Столькі думак злажыў аб ёй важных, таёмных, -
Як і бор гэтак з ветрам шумець не шумеў,
Як і век гэткіх дум не злажыў для патомных!
Гэткі ў сэрцы сваім збудаваў ёй пасад
І такую ўзлажыў ёй з кахання карону, -
Як і неба з зямлёю, на Божы загад,
Не прыдбаюць такіх ні кароны, ні трону!
Так уславіў яе ў славу сонца і зор,
Так маліўся дзень-ноч к ёй мальбою нябёсаў, -
Як і мудрасць не ўславіць ўсясвету прастор,
Як і каня не моліцца ўлетку да росаў!
Утварыў з яе шчасце з-над шчасцяў сваё –
Чарадзейную княжну з аповесці дзіўнай,
І пад ногі ёй кінуў жыццё сваё ўсё...
А яна?. А яна была толькі... дзяўчына!..

**Вядучы 1-ы.** Жыццё не было ласкавым да Янкі Купалы. Шмат у ім было нягод, лёс неаднойчы выпрабоўваў яго на трываласць, на ўменне трымаць удар.

Але Янка Купала не саступаў... Ён тварыў, натхнёны вялікаю ідэяю - убачыць свабодную Беларусь са шчаслівым народам. Нічога больш не патрэбна для шчасця - вывесці край з занядбання. Але не прагнуў славы для сябе, бо сціскалася сэрца ад гароты людской...

***Чытальнік 2-і***(дэкламуе пад музыку верш “Я не паэта ”).

**Вядучы 2-і.** Быў бы шчаслівы Янка Купала... Але не мог, бо бачыў прыгнёт, прыгнёт не столькі матэрыяльны, колькі духоўны. Паэта трывожыла тое, што народ беларускі нібыта ў зачараваным сне, што надзвычай цяжка аказалася дазвацца яго.

Як у моры, ў белым снегу,
Без днявання, без начлегу,
Ў бездарожжа, ў беспрыстанне
Едуць, едуць паязджане.

**Вядучы 1-ы.** А знайшліся і зласліўцы, якія пачалі нашэптваць: кінь, супакойся, не марнуй свае лепшыя дні. Былі і такія, што не разумелі, нашто растрачваць свой талент на заклікі да народа, які нікому не патрэбны як народ. Чаму гэта Янка Купала так сумуе, чаму няма імпэту і весялосці ў яго песнях?

***Чытальнік 3-ці*** (дэкламуе пад музыку).

Вы кажаце: надта пяю я нявесела,
Пацехаў ніякіх не бачу ў людзей...
Пакіньце смяяцца! Вас праўда не ўсцешыла,
Няпраўды ж не знаю ў душы я сваей.
Як пеў я дагэтуль, так пець не сцураюся,
Жальбою маркоцячы песню сваю,
Я ў долю народа свайго узіраюся
І толькі аб гэтым для вас тут пяю.
Няхай свет пазнае ўсе песні бяздольніка,
Хай вораг-мучыцель дрыжыць з праўды слоў,
Быць вольным хай родзяцца думкі ў нявольніка,
Хай быць чалавекам захоча брат мой.

***Чытальнік 1-ы*** (дэкламуе пад музыку).

Я не для вас, паны, о не,
Ў час вольны песенькі складаю, -
Што спала ў сэрцы там на дне -
Буджу і ў свет на суд пускаю.
Я не для вас, паны, о не!
Я не для вас, паны, о не,
Падчас збываюся спакою,
Калі ў вачах сляза блісне,
Маркотнай вызвана душою, -
Я не для вас, паны, о не!
Я не для вас, паны, о не,
Свае дні лепшыя марную, -
У вечнай з мукамі вайне
Жыву і радасці не чую –
Я не для вас, паны, о не!
Я не для вас, паны, о не,
Падняць скібіну слова рвуся
На запусцелым дзірване
Сваёй старонкі Беларусі,
Я не для вас, паны, о не!

**Вядучы 2-і.** Прыйшлі часы, калі да папараць-кветкі беларускага народа пацягнуліся заляпаныя крывёю рукі. Кветку хацелі збэсціць, пагасіць яе бляск, стаптаць, змяшаць з брудам. Купала змагаўся, але сілы былі няроўныя...

***Чытальнік 2-і*** (дэкламуе пад музыку верш) “О так! Я - пралетар!.. ”).

**Вядучы 1-ы.** Янка Купала зваў з цемры да святла. Ён заклікаў нас людзьмі звацца...

А людзі, глянуўшы на сонца, адказ казалі грамадой: “Па колькі нам дасі чырвонцаў, калі мы пойдзем за табой?”

**Вядучы 2-і.** Сэрца паэта перестала біцца 28 чэрвеня 1942 года ў Маскве. Праз тысячу шляхоў адчула гэта матчына сэрца і спынілася - праз два дні пасля смерці сына. Хавалі іх у адзін дзень.

**Вядучы 1-ы.** Не збярог беларускі народ сваю папараць-кветку. Сышла яна. Зноў блукаем у цемры, але ўжо не безнадзейныя, бо над намі гучыць малітва Янкі Купалы - малітва за ўсіх нас, за Беларусь...

*Гучыць песня “Малітва” на словы Янкі Купалы.* Пачынае мужчынскі голас, на другім куплеце ўступае дзявочы. Трэці куплет дэкламуецца пад музыку. Напрыканцы гучыць двухгалоссе... Усе акцёры, чытальнікі, удзельнікі кампазіцыі, устаюць з крэслаў і падымаюць свечкі. Дзеянне суправаджаецца мультымедыйнай прэзентацыяй, на якой дэманструюцца партрэты песняра розных перыядаў яго жыцця.

Песню бярыце з сабою

**МАЛІТВА**

*Тэкст Янкі Купалы*

*Музыка Алега Молчана*

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,




Распятаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.
*П р ы п е ў:*
Малюся я небу, зямлі і прастору,
Магутнаму Богу - Ўсясвету малюся,
Ва ўсякай прыгодзе, ва ўсякую пору
За родны народ Беларусі.
Я буду маліцца да яснага сонейка,
Няшчасных зімой саграваць сірацін,
Прыветна па збожных гуляючы гонейках,
Часцей заглядаці да цёмных хацін.
*П р ы п е ў:*
Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,

Распятаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Не вылі над роднай зямлёй, над табой

## ЯНКА КУПАЛА І ЯКУБ КОЛАС

*Віктарына для старэйшых класаў*

*Петрашкевіч, М. Янка Купала і Якуб Колас : віктарына для старэйшых класаў / М. Петрашкевіч // Роднае слова. – 2012. - №6. – С. 66-70.*

У гульні прапануецца прасачыць і параўнаць жыццёвыя і творчыя шляхі паэтаў.

*ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ*: Удзельнічаюць дзве каманды: каманда Янкі Купалы і каманда Якуба Коласа. У першым і другім турах (а таксама некаторыя пытанні іншых тураў) гучаць агульныя пытанні, удзельнікі даюць адказы пра пісьменніка, якога прадстаўляе іх каманда. Для падрыхтоўкі адказу камандам даецца адна хвіліна. Хто гатовы адказваць, паведамляе вядучаму. Каманда, якая першая дасць правільны адказ, атрымлівае два балы, другая каманда за правільны адказ атрымлівае адзін бал. У выпадку няправільнага адказу другая каманда мае права адказаць за супернікаў, тады за правільны адказ яна атрымлівае тры балы.

З трэцяга тура на пытанне адказвае толькі адна каманда, якая раней падрыхтавала адказ. Максімальны час на падрыхтоўку адказу - адна хвіліна. За правільны адказ каманда атрымлівае два балы.

Няправільныя адказы балаў не прыносяць.

### *І ТУР. КРЫХУ БІЯГРАФІІ*

**•Бліц.**

Міні-гульня для аднаго з удзельнікаў ад кожнай каманды. Праводзіцца па агульных правілах першага і другога тураў. Пасля бліц-апытання два балы даецца камандзе, удзельнік якой набраў больш балаў.

1. *Сапраўднае імя пісьменніка.*

Янка Купала: Іван Дамінікавіч Луцэвіч.

Якуб Колас: Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.

2. *Дата нараджэння пісьменніка.*

Янка Купала: 7 ліпеня 1882 г.

Якуб Колас: 3 лістапада 1882 г.

3. *Дзе нарадзіўся пісьменнік?*

Янка Купала: фальварак Вязынка.

Якуб Колас: засценак Акінчыцы (недалёка ад Стоўбцаў).

4. *На якой мове пачынаў пісаць вершы?*

Янка Купала: на польскай мове.

Якуб Колас: на рускай мове.

5. *Як называецца першы апублікаваны верш пісьменніка?*

Янка Купала: “Мужык”.

Якуб Колас: “Наш родны край”.

*6. Дзе ён быў апублікаваны?*

Янка Купала: газета “Северо-Западный край”.

Якуб Колас: газета “Наша Доля”.

*7. У якім годзе гэта было?*

Янка Купала: у 1905 г.

Якуб Колас: у 1906 г.

*8. Кім былі бацькі пісьменніка?*

Янка Купала: збяднелыя шляхцічы.

Якуб Колас: бацька быў ляснік.

*9. Калі выйшаў першы зборнік?*

Янка Купала: у 1908 г.

Якуб Колас: у 1910 г.

*10.Як называўся першы зборнік паэта?*

Янка Купала: “Жалейка”.

Якуб Колас: “Песні жальбы”.

*11.У якіх навуковых установах працавалі паэты?*

Янка Купала: Інстытут беларускай культуры, Акадэмія навук.

Якуб Колас: Інстытут беларускай культуры, Акадэмія навук.

*12.У якім годзе было прысуджана званне народнага паэта Беларусі?*

Янка Купала: у 1925 г.

Якуб Колас: у 1926 г.

*13.Калі памерлі пісьменнікі?*

Янка Купала: 18 чэрвеня 1942 г.

Якуб Колас: 13 жніўня 1956 г.

*14.Дзе памерлі пісьменнікі?*

Янка Купала: у Маскве.

Якуб Колас: у Мінску.

*15.Дзе пахаваны пісьменнікі?*

Янка Купала: быў пахаваны ў Маскве, а ў 1962 г. урна з прахам Янкі Купалы перавезена ў Мінск на Вайсковыя могілкі.

Якуб Колас: на Вайсковых могілках у Мінску.

• **Апытанне.**

**1.** Галоўнае ў жыцці моладзі атрымаць добрую адукацыю. Да адукацыі імкнуліся і нашы пісьменнікі. Пералічыце, дзе вучыліся Янка Купала і Якуб Колас.

*Янка Купала:* у вандроўнага настаўніка, у Сенніцкім двухкласным народным вучылішчы (зіма 1889 - 1890 гг.), у народным вучылішчы ў мястэчку Бяларучы (з восені 1897 да вясны 1898 г.), на курсах Чарняева ў Пецярбургу (1909 - 1913), у народным універсітэце імя А. Шаняўскага ў Маскве (1915).

*Якуб Колас:* у вандроўнага настаўніка, Потым у народнай школе ў вёсцы Мікалаеўшчына, у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1898 - 1902), у Аляксандраўскім ваенным вучылішчы (скончыўу 1916 г.).

**2.** Каб жыць, трэба працаваць - гэта ведаюць усе. А кім працавалі пісьменнікі?

*Янка Купала:* вандроўным настаўнікам, пісарам у судовага следчага, малодшым прыказчыкам, памочнікам вінакура на бровары, бібліятэкарам, супрацоўнічаў у газеце “Наша Ніва”, сакратаром у “Беларускім выдавецкім таварыстве”, адказным рэдактарам “Нашай Нівы”, сакратаром часопіса “Вольны сцяг”, працаваў у Акадэміі навук.

*Якуб Колас:* настаўнікам, школьным інспектарам, выкладчыкам у Беларускім педагагічным тэхнікуме і БДУ, віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР.

**3.** У пачатку мінулага стагоддзя пісаць рэвалюцыйныя вершы пад сапраўдным прозвішчам было вельмі рызыкоўна. А якія псеўданімы былі ў нашых песняроў?

*Янка Купала:* Вайдэлота, Здарэнец, Левы, Марка Бяздольны, Стары Мінчук, Вінцук з-пад Мінска, Цімох Каруза.

*Якуб Колас:* Тарас Гушча, Агарак, Адзінокі, Альбуцкі К., Андрэй “сацыяліст”, К. Беларус, Тамаш Булава, Груд Ганна, Дзямянаў Гуз, Дзядзька Карусь, Карусь Лапаць, Мікалаевец, Дубовы ліст, Кудесник, Стары шут, Торба Іван.

**4.** Сёння Івана Луцэвіча і Канстанціна Міцкевіча ўсе ведаюць пад псеўданімамі Янка Купала і Якуб Колас. А чаму пісьменнікі пакінулі сабе менавіта такія імёны?

*Янка Купала:* паэт нарадзіўся ў ноч на Купалле. Таму і псеўданім - Янка Купала. Ёсць меркаванне, што такое імя яму раіў беларускі пісьменнік Ядвігін Ш.

*Якуб Колас:* будучы студэнтам, Канстанцін Міцкевіч захапляўся творчасцю рускага пісьменніка Якубовіча-Мельшына. Асабліва яму падабаўся верш пра колас. Так, гартаючы кнігу Якубовіча-Мельшына, малады Канстанцін Міцкевіч і назваў сябе Якуб(овіч) Колас.

**5.** У розныя часы і Янка Купала, і Якуб Колас мелі праблемы з прадстаўнікамі ўлады. Узгадайце, калі і ў чым абвінавачвалі пісьменнікаў.

*Янка Купала:* стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій улетку 1930 г. Яго рэгулярна выклікалі ў АДПУ, патрабавалі паказанняў пра “контррэвалюцыйную” арганізацыю “Саюз вызвалення Беларусі”, лідарам якой ён нібыта быў. Супрацоўнікі АДПУ не пакідалі Янку Купалу ў спакоі да яго смерці.

*Якуб Колас:* за ўдзел у настаўніцкім нелегальным з’ездзе Якуба Коласа асудзілі на тры гады турэмнага зняволення (1908 - 1911). У 1937 г. на яго завялі справу. Яго абвінавачвалі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці, у арганізацыі “Саюза вызвалення Беларусі”. 6 лютага 1938 г. у доме

пісьменніка супрацоўнікі АДПУ шукалі зброю. Пагроза арышту над Якубам Коласам вісела да 1953 г. Але арыштаваны ён не быў.

## II ТУР. СТАРОНКІ ТВОРЧАСЦІ

Каманды па чарзе чытаюць на памяць вершы “сваіх” пісьменнікаў (за кожны верш каманда атрымлівае адзін бал).

**1.** Свой першы верш не апублікаваў ні Янка Купала, ні Якуб Колас (яны былі надрукаваны пазней). Узгадайце гэтыя вершы, калі яны былі напісаны і што з імі звязана.

*Янка Купала:* вершы пачаў пісаць у 1903 г. на польскай мове, некаторыя з іх былі апублікаваны ў часопісе “Ziarno” (“Зерне”). Адзін з самых вядомых вершаў - “Мая доля” (1904). Маці народнага паэта - Бянігна Іванаўна - была ўпэўнена ў тым, што калі Янка Купала пісаў бы вершы па-польску, то быў бы больш шчаслівы і заможны.

*Якуб Колас:* адзін з першых вершаў “Вясна” напісаў у 12 гадоў. За гэты верш бацька даў малому Кастусю сярэбраны рубель - на той час вялікія грошы.

**2.** Шмат вершаў і апавяданняў напісалі паэты. Творы выходзілі асобна і зборнікамі. Назавіце дарэвалюцыйныя зборнікі.

*Янка Купала:* “Жалейка” (1908), “Гусляр” (1910), “Шляхам жыцця” (1913).

*Якуб Колас:* “Песні жальбы” (1910), кніга прозы “Апавяданні” (1912), “Родныя з’явы” (1914).

**3.** Адзін за адным выходзілі ў свет новыя творы беларускіх песняроў. Узгадайце, у якой паслядоўнасці гэта адбывалася.

Каманды атрымліваюць лісты з назвамі твораў, якія павінны размясціць у храналагічным парадку.

*Янка Купала:* зборнік “Жалейка” (1908), п’еса “Паўлінка” (1912), зборнік “Спадчына” (1922), верш “Хлопчык і лётчык” (1935), зборнік “Шляхам жыцця” (1913), верш “Беларускім партызанам” (1941), паэма “Гусляр” (1910).

*Якуб Колас:* кніга прозы “Апавяданні” (1912), зборнік “Родныя з’явы” (1914), аповесць “Дрыгва” (1934), паэма “Суд у лесе” (1943), заканчэнне паэмы “Сымон-музыка” (1925), выданне кнігі “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” (1910), заканчэнне паэмы “Новая зямля” (1923).

**4.** Назавіце галоўных герояў п'есы "Тутэйшыя" і паэмы "Новая зямля".

*Янка Купала:* Мікіта Зносак, Гануля Зносчыха, Лявон Гарошка, Янка Здольнік, Аленка, Наста Пабягунская, Генрых Мотавіч Спічыні, Усходні вучоны, Заходні вучоны.

*Якуб Колас:* Міхал, Антось, Ганна, Уладзя, Алесь, Кастусь.

**5.** Назавіце знакамітыя творы пісьменнікаў ваеннай пары.

*Янка Купала:* “Паўстаў народ”, “Беларускім партызанам”, “Хлопчык і лётчык на вайне”, “Зноў будзем шчасце мець і волю”, “На Гітлера звера” і інш.

*Якуб Колас:* паэмы: “Суд у лесе”, “Адплата”, “Сустрэча з ворагам”; апавяданні: “У разведцы”, “Санітарка Таня”; вершы: “Душою і сэрцам мы з вамі, героі”, “Фашысцкім бандытам”, “На абарону”, “Над магілай партызана”, “Байцам і камандзірам Чырвонай арміі” і інш.

**III ТУР. ЯНКА КУПАЛА І ЯКУБ КОЛАС - СЯБРЫ**

1. Назавіце аўтара наступных радкоў:

Без Коласа ў Купалы менш красы,

А без Купалы пабяднее Колас.

*(Мікола Маляўка)*

**2.** Янка Купала і Якуб Колас былі сябрамі. У 20 - 30-я гг. падчас сталага жыхарства ў Мінску яны сустракаліся амаль штодня. Калі і пры якіх абставінах адбылася іх першая сустрэча?

*(Сустрэліся яны ў жніўні 1912 г., пасля пяці гадоў завочнага знаёмства. Янка Купала ехаў да Якуба Коласа, і сустрэліся яны на хутары Смольня. Даехаўшы да Стоўбцаў, Янка Купала пайшоў пешшу праз лес і заблудзіўся. Ён баяўся, што прыйдзецца заначаваць у лесе. Але потым успомніў, што Якуб Колас жыве на беразе Нёмана і стаў трымацца нізін, ад якіх цягнула вільгацю. Гэтыя нізіны і вывелі яго на дарогу.)*

**3.** Пра гэтую сустрэчу пісьменнікі не раз яшчэ ўзгадаюць, напішуць вершы, артыкулы. Але і іншыя дзеячы мастацтва не абмінулі сваёй увагай першую сустрэчу песняроў. Так, у 1959 г. была напісана карціна, на якой адлюстравана іх першая сустрэча. Узгадайце мастака і назву карціны.

*(Яўген Харытоненка. “Першая сустрэча Янкі Купалы і Якуба Коласа”. Фонд Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.)*

**4.** Праз год пісьменнікі пабачыліся зноў. У Вільні. Падчас вясельнага падарожжа Якуба Коласа. Пасля чаго лёс разлучыў сяброў на доўгія гады. Калі і дзе адбылася наступная сустрэча Янкі Купалы і Якуба Коласа?

*(У Мінску ў 1921 г.)*

**5.** Пісьменнікі сябравалі сем'ямі, часта сустракаліся. Два паэты былі неразлучнымі: у падарожжах, на сустрэчах з чытачамі, на розных урачыстасцях, на адпачынку. Часта бавілі час за гульнёй. За гэтым заняткам сябры маглі прасядзець усю ноч. У якую гульню яны гулялі?

*(У шахматы)*

**6.** Янка Купала і Якуб Колас вельмі любілі шахматы. Падчас адпачынку ў санаторыі Якуб Колас у адным з лістоў да жонкі пісаў: “Работы няма, а час праходзіць. Вольныя ж мінуты часта запаўняюцца шахматамі. Але Янка часцей абыгрывае мяне...” Пра любоў песняроў да шахмат ведала шмат людзей, у тым ліку і мастак, які напісаў карціну “Янка Купала і Якуб Колас гуляюць у шахматы”. Назавіце імя гэтага мастака.

*(Генрых Бржазоўскі)*

**7.**18 чэрвеня 1942 г. у Маскве трагічна загінуў Янка Купала. Якуб Колас у той час напісаў: "Парваліся струны, разбіты / Цудоўныя гуслі твае. / Краіна жалобай спавіта - / Байца-песняра не стае. / Спі спакойна, спачывай - / Не забудзе цябе край". Як называецца гэты верш?

*(“Над магілай друга”)*

## IV ТУР. БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНЯРЫ І СВЕТ

**1.** У гэтым вершы Максім Горкі ўбачыў “нешта накшталт беларускага гімна” і пераклаў на рускую мову. Пазней гэты верш быў перакладзены на 82 мовы свету. Польскі кампазітар Людамір Рагоўскі, аўтар балета “Купала”, напісаў да гэтага верша музыку.Яна да рэвалюцыі выконвалася як беларускі гімн. Пра які верш ідзе гаворка?

*(“А хто там ідзе”)*

**2.** Янка Купала і Якуб Колас акрамя літаратурнай дзейнасці займаліся яшчэ і навуковай. Яны працавалі ў Інстытуце беларускай культуры, потым у Акадэміі навук БССР. Якуб Колас быў заслужаны дзеяч навук Беларусі. А Янка Купала быў акадэмікам не толькі Акадэміі навук БССР... У якой яшчэ краіне Янка Купала быў абраны акадэмікам?

*(Ва Украіне)*

**3.** “...У Беларусі ёсць два паэты: Янка Купала і Якуб Колас - вельмі цікавыя хлопцы! Так прымітыўна-проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым бы трошкі такіх якасцей! О Божа! Вось бы добра было!” Хто так пісаў?

*(Максім Горкіў 1910 г.)*

**4.** Памяць пра беларускіх песняроў захоўваюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. Пералічыце гарады замежных краін, дзе памяць пра Янку Купалу і Якуба Коласа ўшанавана ў назвах вуліц або дзе ўстаноўлены ім помнікі    (удзельнікі адказваюць па правілах першага і другога тураў).

*Янка Купала:* Масква, Нью-Ёрк - помнікі; Кіеў, Херсон, Сумы, Ніжні Ноўгарад, Іркуцк, Орск, Валгаград, Чабаксары, Гайнаўка (Польшча) - названы вуліцы; Вільнюс - мемарыяльная дошка.

*Якуб Колас:* Кіеў, Гайнаўка (Польшча) - названы вуліцы; Ташкент (названа вуліца; на будынку, дзе жылі пісьменнікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны захавалася мемарыяльная дошка).

## V ТУР. ПЕСНЯРЫ І МАСТАЦТВА

**Драматургія.**

Праз паўгода пасля напісання гэтая п'еса была пастаўлена ў Вільні Беларускім музычна-драматычным гуртком, праз месяц яе маглі бачыць жыхары Пецярбурга. Сёння п'еса - візітная картка аднаго з беларускіх тэатраў, менавіта з яе тэатр пачынае кожны новы тэатральны сезон. У1952 г. па спектаклі быў зняты аднайменны кінафільм, і стаў ён першым беларускім фільмам-спектаклем (рэжысёр А. Зархі), а ў 1973 г. пастаўлена аперэта. Назавіце п'есу.

*(“Паўлінка”)*

**Кінематаграфія.**

Па матывах гэтай аповесці Якуб Колас у 1937 г. напісаў п'есу "У пушчах Палесся", пазней кампазітар А. Багатыроў стварыў оперу, а “Беларусьфільм” зняў чатырохсерыйны фільм “Талаш”. Прататыпам

галоўных герояў гэтых твораў стаў палескі селянін Васіль Талаш, які партызаніў падчас дзвюх войнаў. Пра якую аповесць ідзе гаворка?

*(“Дрыгва”)*

**Жывапіс.**

Першы жывапісны партрэт Янкі Купалы быў напісаны ў 1920 г. у Мінску. У наступным годзе з'явіліся яшчэ два партрэты Янкі Купалы гэтага ж мастака. Яны добра ведалі адзін аднаго, сябравалі, часта бачыліся на працягу некалькіх гадоў (пакуль мастак не з'ехаў у Ленінград). Цяпер гэтыя партрэты знаходзяцца ў літаратурным музеі Янкі Купалы і ўпрыгожваюць выставы. Назавіце мастака першых жывапісных партрэтаў Янкі Купалы?

*(Дзмітрый Полазаў)*

Гэтая серыя пейзажаў-рэканструкцый і інтэр'ераў-рэканструкцый, што згадваюцца ў паэме “Новая зямля” і трылогіі “На ростанях”. Праца над серыяй пачалася ў 1986 г. і доўжылася тры з паловай гады. Усяго было створана 23 карціны. На карцінах - інтэр'ерах аўтар адлюстраваў побыт сялян пачатку мінулага стагоддзя: калыска, печ, кросны, прылады сялянскага побыту. Палотны з'яўляюцца ўласнасцю літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Назавіце мастака і назву серыі карцін.

*(Уладзімір Сулкоўскі. “Радзіма Якуба Коласа”)*

**Ілюстратары кніг.**

Гэты чалавек - народны мастак Беларусі - для дыпломнай працы ў інстытуце абраў тэму “Ілюстрацыі паводле паэмаў Янкі Купалы”. Ён выдатна абараніў сваю працу і атрымаў дыплом Акадэміі мастацтваў СССР. Неўзабаве выдавецтва “Беларусь” прапанавала яму праілюстраваць падарункавае выданне паэзіі Якуба Коласа пад назвай “З майго летапісу”. Потым ён ілюстраваў кнігу паэм Янкі Купалы, якая выйшла ў выдавецтве “Мастацкая літаратура”, а затым –“Новую зямлю” Якуба Коласа. Назавіце гэтага мастака.

*(Васіль Шаранговіч)*

У1928 - 1929 гг. у выданні Дзяржаўнага выдавецтва БССР выйшаў у свет першы збор твораў Якуба Коласа ў двух тамах. Ён быў праілюстраваны маста- ком з Іркуцкай вобласці. Назавіце мастака.

*(Генадзь Змудзінскі)*

**Мастацкі твор пра песняра.**

30-я гады мінулага стагоддзя - гады выпрабаванняў для дзеячаў беларускай навукі і культуры. Янка Купала, як і іншыя пісьменнікі, быў ахвярай супра- цоўнікаў АДПУ. Яго кожную ноч выклікалі следчыя, прымушалі прызнацца ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Трагедыю жыцця народнага паэта паказаў у сваёй п'есе Алесь Петрашкевіч. Узгадайце, як яна называецца.

*(“Воля на крыжы”)*

Шмат мастацкіх твораў прысвечана Якубу Коласу. У адным з вершаў, прысвечаных пісьменніку, Максім Танк напісаў: “Прысеў на валуне

гранёным, /Дзе на Маскву ідзе шаша, / Паслухаць музыкі Сымона, / Гамонкі дзеда Талаша”.

З якога верша гэтыя радкі?

(“Ля помніка Якубу Коласу”)

## VI ТУР. ПАМЯЦЬ

**1.** Назавіце беларускія мястэчкі, дзе знаходзяцца філіялы літаратурных музеяў пісьменнікаў (удзельнікі адказваюць па правілах першага і другога тураў).

*Янка Купала:* Вязынка, Ляўкі, Акопы, Яхімоўшчына.

*Якуб Колас:* Смольня, Акінчыцы, Альбуць, Ласток.

**2.** У 1991 г. да 110-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа Дзяржаўны банк СССР планаваў выпусціць у свет памятныя манеты з іх выявамі, але ў хуткім часе Савецкі Саюз распаўся. Тым не менш манеты ўсё ж такі выйшлі ў свет. Банк якой краіны іх выпусціў?

*(Нацыянальны банк Расійскай Федэрацыі)*

**3.** Нацыянальны банк Беларусі таксама выпусціў памятныя манеты Янкі Купалы і Якуба Коласа. Калі гэта адбылося?

*(У 2002 г., да 120-годдзя пісьменнікаў)*

**4.** Імя Янкі Купалы і Якуба Коласа ў Беларусі носяць нацыянальныя тэатры. Купалаўскі тэатр у Мінску ведаюць, мабыць, усе. А ў якім горадзе знаходзіцца тэатр імя Якуба Коласа?

*(Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску)*

**5.** У сталіцы помнік Янку Купалу знаходзіцца ў Купалаўскім скверы, а Якубу Коласу - на плошчы Якуба Коласа. Назавіце скульптараў гэтых помнікаў (удзельнікі адказваюць па правілах першага і другога тураў).

*Янка Купала:* А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Заспіцкі.

*Якуб Колас:* З. Азгур.

**6.** Янка Купала і Якуб Колас неаднойчы былі лаўрэатамі літаратурных прэмій. З цягам часу былі заснаваны прэміі, якія носяць іх імёны. У якім годзе заснаваны літаратурныя прэміі імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа? Чым яны адрозніваюцца (удзельнікі адказваюць па правілах першага і другога тураў)?

*Янка Купала:* Дзяржаўная прэмія Беларусі, якая прысуджаецца ўрадам рэспублікі за выдатныя творы ў галіне паэзіі і драматургіі. Заснавана пастановай Савета Міністраў БССР у 1957 г.

*Якуб Колас:* Дзяржаўная прэмія Беларусі, якая прысуджаецца ўрадам рэспублікі за выдатныя творы ў галіне прозы і літаратуразнаўства з 1959 г.

## ВЫНІКІ

Пасля гульні падводзяцца вынікі, падлічваюцца балы, узнагароджваюцца пераможцы.

# “І СЁННЯ З НАМІ КОЛАС І КУПАЛА”

*Літаратурная гасцёўня*

*“І сёння з намі Колас і Купала” : літаратурная гасцёўня, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа // Народная асвета. – 2012. - № 7. – С. 83–85.*

Лёс наканаваў ім не толькі нарадзіцца ў адным годзе. Лёс наканаваў ім усю творчую энергію, сілы сваёй душы і розуму сфакусіраваць на адной велізарнай справе - заснаванні новай беларускай літаратуры і стварэнні беларускай літаратурнай мовы.

25 чэрвеня спаўняецца 130 год з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, а 22 кастрычніка - 130 год з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Сёлета, у Год кнігі, гэтыя даты - повад яшчэ раз зазірнуць у скарбніцу нашай нацыянальнай культуры, дакрануцца да лепшых яе ўзораў. Прапануем вашай увазе сцэнарый пазакласнага мерапрыемства, прысвечанага 130-гадоваму юбілею выдатных беларускіх паэтаў.

***Тэма:*** І сёння з намі Колас і Купала.

***Задачы:***

□ пазнаёміць вучняў з асноўнымі фактамі жыцця народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа;

□ зацікавіць вучняў творамі Купалы і Коласа;

□ развіваць уменне публічнага выступлення;□ выхоўваць любоў і павагу да роднага краю, да літаратурнай спадчыны беларускага народа.

***Абсталяванне:***

□ камп'ютар;

□ мультымедыйны праектар.

***Афармленне:*** партрэты пісьменнікаў, кніжная выстава «І сёння з намі Колас і Купала», плакаты з цытатамі: «Янка Купала - гонар беларускага народа. Нельга ўявіць беларускі народ без такой велічнай постаці, як Янка Купала» (Пятрусь Броўка); «Якуб Колас — наш гонар, надзея, будучыня. Творчасць яго - выток святла, дабрабыту, нязломнасці» (Максім Лужанін).

***Ход мерапрыемства***

**Бібліятэкар.** Добры дзень, паважаныя госці, педагогі і вучні нашай школы! Мы рады ўсіх вітаць у нашай літаратурнай гасцёўні. Сёлета спаўняецца 130 год з дня Нараджэння народных паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

**Настаўнік.** Тэма сённяшняй сустрэчы - «І сёння з намі Колас і Купала». Мы з вамі перагорнем біяграфічныя і творчыя старонкі нашых выдатных пісьменнікаў, пачытаем іх вершы, паслухаем песні на іх словы.

**Бібліятэкар.** А яшчэ - здзейснім завочнае падарожжа ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы і Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, якія знаходзяцца ў Мінску, правядзём віктарыну. Дапамогуць нам у гэтым вучні 5 «В» класа.

*(На экране - слайд з партрэтамі пісьменнікаў і словамі «І сёння з намі Колас і Купала». На фоне мелодыі народнай песні гучаць словы: «Песнярам зямлі беларускай прысвячаецца»)*

**Бібліятэкар.** І кожны, прамовіўшы «Колас Якуб»,
Адразу ж прыпомніць: «Янка Купала».
Чытальнік 1.
Колас. Купала...
У гуках імён іх люлянку я чую,
Якую матуля калісь
над калыскай маёй спявала, -
Колас.
Купала.

***Чытальнік 2.***
Колас. Купала...
Мелодыю мовы славянскай я чую,
Той мовы, якую агнямі палілі,
Ды з попелу
Страцімам-птахам яна паўставала –
Колас.
Купала...

***Чытальнік 3.***
Колас! Купала!
Адвечную песню народа,
Што горда
Жыла ў ім
І кленчыць прад ворагам не
дазваляла!
Колас.
Купала...

**Вядучы 1.** Наш народ з гонарам можа прыгадаць імёны многіх пісьменнікаў, якія ў розныя часы выказвалі думкі і спадзяванні, мары і надзеі беларусаў. І першымі ў гэтым спісе стаяць імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа. Так здарылася, што гэтыя два волаты мастацкага слова прыйшлі ў беларускую літаратуру амаль адначасова і на працягу многіх дзесяцігоддзяў стваралі побач і сябравалі.

***Чытальнік 1.***
Чытаць вершы Купалы і Коласа –
Найвялікшае свята.
Хай яно ўрачыста і молада
Увойдзе ў кожную хату.

Хай для ўсіх загучыць па-новаму,
Узнясецца высока
Беларускае слова кроўнае
Нашых слынных прарокаў.
Бо яны нас вучылі, радзілі,
Як людзьмі называцца.
Аб пачэсным сказалі пасадзе
Беларускае нацыі.
І каб мы свой куточак родны
Не забылі ніколі,
Продкаў славілі моц і годнасць
І імкненне да волі.

**Вядучы 2.** У нашым народзе існавала легенда пра тое, што ля калыскі кожнага немаўляці збіраюцца чараўніцы і прарочаць яму лёс. Відаць, мудрыя чараўніцы стаялі і ля калысак Янкі Купалы і Якуба Коласа і прадказалі ім лёс слаўны, складаны, велічны.

**Вядучы 3.** 1882 год - год нараджэння абодвух класікаў беларускай літаратуры. Таксама блізкія жыццёвыя шляхі выдатных пісьменнікаў. Сям'я Янкі Луцэвіча, будучага Янкі Купалы, у пошуках працы і сродкаў існавання шмат разоў пераязджала з месца на месца, галоўным чынам у наваколлях Мінска. Пасля смерці бацькі ў 1902 годзе на плечы Янкі як старэйшага сына леглі клопаты пра блізкіх.

**Вядучы 4.** Дзіцячыя гады Кастуся Міцкевіча, будучага Якуба Коласа, таксама прайшлі ў вандроўках. Бацьку паэта, які служыў лесніком у князя Радзівіла, часта пераводзілі з месца на месца.

**Вядучы 1.** У жыццёвых цяжкасцях, што выпалі на долю іх сем'яў, з малых гадоў спасцігалі таленавітыя сялянскія хлопцы Янка і Кастусь самую мудрую з навук - навуку народнага жыцця. Яна давала ім сілы, нараджала паэтычнае натхненне. І свае першыя вершы будучыя народныя песняры напісалі амаль у адзін і той жа час.

*(Вучні чытаюць уголас першыя вершы паэтаў: Я. Купалы «Мая навука», Я. Коласа «Песня аб вясне»)*

**Вядучы 1.** І псеўданімы абодва паэты ўзялі сімвалічныя. Купала - у гэтым псеўданіме імкненне нашага выдатнага песняра жыццём і песняй дапамагчы народу знайсці сваё шчасце, якое са старажытнасці сімвалізавала цудадзейная папараць-кветка. Колас - гэта хлеб, гэта само жыццё, а значыць, сваім жыццём і творчасцю паэт меркаваў быць заўсёды трывала спалучаным з народам, з роднай зямлёй.

**Вядучы 2.** Калі прыняць пад увагу, што і Купала, і Колас стваралі ў адзін і той жа час, што абодва апявалі пераважна родны край, прыроду, вёску і яе людзей, то не даводзіцца здзіўляцца, што многія іх творы падобныя па матывах, тэматыцы, вобразах.

*(Вучань чытае верш Якуба Коласа «Усход сонца»)*

**Вядучы 3.** У той жа час Янка Купала і Якуб Колас з самага пачатку і да канца свайго творчага жыцця ўяўляюць сабой галасы непадобныя, з рознымі тэмбрамі і дыяпазонамі, з рознай сілай пачуцця і эмоцый. Кожны з іх - самабытная творчая асоба, са своеасаблівымі эстэтыкай і стылістыкай.

**Вядучы 4.** Янка Купала па характары таленту - пераважна паэт-лірык, узнёслы, рамантычны, летуценны, мінорны. Створаныя ім вобразы, карціны часта нясуць сімвалічную, філасофскую нагрузку. Яго паэзія ўвабрала самыя інтымныя рухі чалавечай душы.

*(Вучні чытаюць вершы Янкі Купалы «Летам» і «Зімой у лесе»)*

**Вядучы 1.** Якуб Колас - творца разважлівы і ўдумлівы. Гэта пераважна паэт-рэаліст. У яго паэзіі дамінуюць канкрэтныя вобраз, карціна, характар. Ён - аптыміст, верыць у чалавека; яго кнігі вучаць любіць жыццё, цаніць яго радасці.

*(Вучань чытае верш Якуба Коласа «Ручай»)*

**Вядучы 2.** Янку Купалу і Якубу Коласу давялося жыць і ствараць на памежжы дзвюх эпох. На пачатку мінулага стагоддзя яны заявілі пра сябе на ўвесь голас і сталі яркімі зоркамі на паэтычным небасхіле беларускай літаратуры.

Народныя паэты сеялі зерне праўды, любові, пранікл ў таямніцы нацыянальнага характару. Іх творчасць абуджае пачуццё нацыянальнай годнасці. Паслухайце песню вядомага кампазітара Ігара Лучанка на словы Янкі Купалы «Спадчына».

*(Гучыць песня «Спадчына». На экране дэманструецца фільм «Замкі Беларусі». http://www.youtube.com/watch?v=JWlg_zbLp3Y)*

**Вядучы 3.** Сапраўднае імя Янкі Купалы - Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Ён нарадзіўся ў фальварку Вязынка былой Радашковіцкай вобласці (цяпер гэта Маладзечанскі раён Мінскай вобласці) амаль на свята Івана Купалы.

А зараз паслухайце песню выдатнага беларускага кампазітраа Юрыя Семянякі на верш Янкі Купалы «Явар і каліна».

*(Гучыць песня «Явар і каліна». На экране фільм «Прырода роднага краю». http://www.youtube.com/watch?v=2XV5-NBdA0w)*

**Вядучы 1**. І зноў - вершы.

*(Вучні чытаюць вершы «Хлопчык і лётчык» Янкі Купалы і «На рэчцы зімой» Якуба Коласа)*

**Вядучы 4.** Аўтар верша «На рэчцы зімой», Якуб Колас, нарадзіўся ў сям'і лесніка князя Радзівіла ў засценку Акінчыцы, непадалёк ад вёскі Мікалаеўшчына - цяпер гэта Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці. Сапраўднае імя паэта - Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.

**Вядучы 1.** З маленства хлопчык разам з бацькамі пераязджаў з адной лесніч оўкі ў іншую, мяняючы, здаралася, абжытую мясцовасць на глухамань. З таго часу ў душу Кастуся запала пачуццё спагадлівасці і любові да пакрыўджаных і абяздоленых людзей працы.

**Вядучы 2.** Таксама жыццё ў лясной глухамані давала магчымасць уражліваму хлопчыку адчуць чароўную прыгажосць беларускіх краявідаў.

Дзіцячыя ўражанні леглі ў аснову многіх вершаў паэта, прысвечаных непаўторнай прыродзе Беларусі.

*(Вучні чытаюць вершы Якуба Коласа «На лузе», «Зіма», «Дзед-госць»)*

**Вядучы 3.** Многія вершы Якуба Коласа пакладзены на музыку, і зараз мы паслухаем песню «Мой родны кут», музыку да якой напісаў Ігар Лучанок.

*(Гучыць песня «Мой родны кут». На экране - краявіды горада Кобрына)*

**Вядучы 4.** Беларусы берагуць і шануюць спадчыну сваіх народных песняроў. У Мінску ім узведзены велічныя помнікі: Якубу Коласу - на плошчы, якая носіць яго імя, Янку Купалу - у скверы, які таксама носіць імя паэта.

**Вядучы 3.** У сталіцы і на радзіме песняроў створаны музеі, якія захоўваюць каштоўныя архіўныя матэрыялы, асабістыя рэчы паэтаў. Зараз мы вам прапануем зрабіць завочнае падарожжа у музеі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

*(На экране дэманструюцца троххвілінныя фільмы «Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Коласа» і «Дзяржаўны літаратурны музей Купалы»)*

**Настаўнік.** Я люблю твой прастор,
Гмах шырокі балот,
Дзе бубняць бугаі,
Дзе красуе чарот,
І дзе травы, як мора, ляглі,
Калі лес там, дык лес:
Можна тыдзень дыбаць;
А прастор, дык прастор –
І канца не відаць,
Не ахопіш, не змерыш зямлі.

Гэтыя радкі - з верша «Палессе», які Якуб Колас напісаў у 1916 годзе. Яны - пра наш Палескі край. На Палессе Колас прыехаў пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. З 1904 года паэт жыў і працаваў у вёсцы Пінкавічы. У школе, дзе настаўнічаў Якуб Колас, цяпер створаны музей пісьменніка. Спадзяюся, што мы з вамі пабываем у ім, і вы самі ўбачыце экспанаты, якія расказваюць пра пінкавіцкі перыяд жыцця выдатнага паэта.

**Бібліятэкар.** А зараз прапануем вызначыць самага ўважлівага ўдзельніка сённяшняй сустрэчы. І дапаможа нам віктарына.

*Пытанні віктарыны*

□ У якім годзе нарадзіўся Янка Купала?
□ Калі нарадзіўся Якуб Колас?
□ У якой вёсцы нарадзіўся Янка Купала?
□ Дзе знаходзіцца радзіма Якуба Коласа?
□ Якія творы Янкі Купалы вы ведаеце?
□ Якія казкі Якуба Коласа вы чыталі?
□ Назавіце сапраўднае імя Янкі Купалы.

□ Назавіце сапраўднае імя Якуба Коласа.

□ Якія песні на словы Янкі Купалы вы ведаеце?

□ Якія песні на словы Якуба Коласа вы ведаеце?

□ Назавіце першыя вершы паэтаў.

□ У гонар якога пісьменніка ў Мінску названы плошча і вуліца, а ў гонар якога - вуліца?

*(Найбольш актыўныя ўдзельнікі віктарыны ўзнагароджваюцца кнігамі Якуба Коласа і Янкі Купалы)*

**Бібліятэкар.** Малайцы! Вашы адказы на пытанні віктарыны паказалі, што вы ўважліва слухалі і нядрэнна ведаеце біяграфію нашых цудоўных пісьменнікаў. А для таго каб даведацца яшчэ больш, мы прапануем вам пазнаёміцца з кніжнай выставай «І сёння з намі Колас і Купала». На ёй - кнігі Янкі Купалы і Якуба Коласа, кнігі пра іх жыццё і творчасць, якія ёсць у нашай школьнай бібліятэцы.

*(Бібліятэкар праводзіць міні-экскурсію па выставе)*

# “ЕН І СЁННЯ З НАМІ, НАШ КУПАЛА”

*Літаратурная вечарына*

*Гучыць мелодыя песні “Радзіма мая дарагая ” (А. Бачыла, Ул. Алоўнікаў). Адкрываецца заслона. На сцэне — удзельнікі літаратурна - музычнай кампазіцыі, апранутыя ў беларускія нацыянальныя строі. Мелодыя песні заціхае, адзін з удзельнікаў чытае радкі:*

Радзіма мая дарагая,
Красуйся і ў шчасці жыві.
Я сэрцам табе прысягаю
У шчырай сыноўняй любві.

Паказваюцца кадры з дакументальных фільмаў пра сучасную Беларусь. У гэты час пачынае гаварыць вядучы.

**1- ы вядучы.** Сёння наша Беларусь — краіна шматлікіх фабрык і заводаў, краіна новабудоўляў, шырокіх і ўрадлівых палеткаў. Але мы ведаем, што калісьці гэта быў лапцюжны і сярмяжны край, зямля бяды і гора людскога.

*Янка Купала. Беларусі ардэнаноснай.*

Чым ты была, Беларусь мая родная, —
Хіба ж не бачылі нашыя вочы?
Вечна абдзёртая, вечна галодная,
Сонца не ведала, а толькі ночы.
Людзі твае, ў беднаце гадаваныя.
З торбай жабрацкаю век дажывалі...
Злосна стагналі вятры над курганамі.
Хмары насіліся чорнаю хваляй.

**2- і вядучы.** Плач усёй Беларусі распавёў «на свет цэлы» наш пясняр. Янка Купала быў народжаны самім жыццём, тагачаснай явай.

*Янка Купала. Я не паэта...*

Кожны край мае тых, што апяваюць,
Чым ёсць для народа ўпадак і хвала,
А беларусы нікога ж не маюць,
Няхай жа хоць будзе Янка Купала.

**1-ы вядучы.** Паэт палюбіў зямлю Беларусі, разгледзеў тут кожную травінку, кожнае дрэва, пабачыў, як расквітаюць верасы, наліваецца колас, выплывае месяц на сіні начлег.

**2-і вядучы.** Яго нарадзіла зямля Беларусі, каб потым паэт пачуў яе стогн і плач, убачыў гора і галечу роднага народа, занядбанасць беларускага мужыка, нішчымніцу беларускіх вёсак, каб панёс іх крыўду «на свет цэлы» за права «людзьмі звацца».

**1-ы вядучы.** У нашым народзе бытавалі паданні пра тое, што ля калыскі кожнага немаўляці збіраюцца чараўніцы і прарочаць яму лёс. Відаць, мудрыя чараўніцы стаялі і ля калыскі Янкі Купалы і судзілі лёс самы слаўны, самы цяжкі і вялікі. Паэту наканавана было гадамі блукаць упоцемках і выйсці на святло, аслепнуць ад яго, але вывесці з цемры іншых.

*Гучыць сумная мелодыя беларускай народнай песні, паказваюцца кадры з дакументальнага фільма «А зязюля кукавала», які расказвае пра Купалаўскія мясціны.*

**2-і вядучы.** Родная Вязынка. Мілы сэрцу бацькоўскі кут.

**1-ы вядучы.** Тут, на хутары Вязынка, у час свята Івана Купалы ў сям’і арандатара нарадзіўся Іван Дамінікавіч Луцэвіч.

*Канстанцыя Буйло. У Вязынцы.*

У хатцы маленькай радзіўся паэт,
Дзе чадна дыміла лучына.
Раз першы адгэтуль ён глянуў на свет
Праз вокны вось гэтай хаціны.

**2-і вядучы.** Яго юнацтва пачалося з суровых будняў — будучы паэт працаваў хатнім настаўнікам, перапісчыкам у судовага следчага, прыказчыкам у панскім маёнтку, рабочым на броварах. Універсітэтам Янкі Купалы было само жыццё.

*Янка Купала. Мая навука.*

Мне мудрасці кніжнай не даў Бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў такіх —
Наўчыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх без школы і кніг.
Ад самай красы маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў беларускі абшар;
Усходы палеткаў і гоманы ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі ў дар.

*Гучыць песня «І вецер, і сокал, і я» (верш Янкі Купалы. муз. Аляксея Туранкова) або іншая песня на вершы песняра.*

**1-ы вядучы.** Янка Луцэвіч вырас у вёсцы. Ен жыў і абвострана ўспрымаў усё навакольнае.

*Канстанцыя Буйло. У Вязынцы.*

А ён падрастаў, беларускі хлапчук,
З прачулай, гарачай душою,
І ўсё, што пабачыў, усё, што пачуў,
У сэрца ўбіраў маладое.
Народныя песні будзілі думу —
Тужлівыя, быццам шум бору...
І сталі з дзяцінства знаёмы яму
Людскія нядоля і гора.

**2-і вядучы.** Беззямелле, неўладкаванасць сялянскага жыцця, прыніжэнне чалавечай годнасці селяніна-беларуса сталі прычынамі трагеды

цэлага народа, якому адмаўлялі ў праве «людзьмі звацца». Усё гэта выклікала з'яўленне Купалы-паэта, які на пачатку сваей творчасці мужна заявіў:

*Янка Купала. Я не для вас...*

Я не для вас, паны, о не,
Падняць скібіну слова рвуся
На запусцелым дзірване
Сваей старонкі Беларусі,
Я не для вас, паны, о не!
Я не для вас, паны, о не,
А я для бедных і загнаных,
Я з імі мучуся ўраўне,
Шадных закут з імі кайданах...
Я не для вас, паны, о не!

*Па сцэне павольна праходзіць група вучняў, апранутых у беднае сялянскае адзенне, абутых у лапці, з торбамі за плячыма.*

*Янка Купала. А хто там ідзе...*

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
Беларусы.
А чаго ж, чаго захацелась ім.
Пагарджаным век, ім, слягіым, глухім?
Людзьмі звацца.

**1-ы вядучы.** «Людзьмі звацца!» Гэты заклік стаў лейтматывам усёй дакастрычніцкай творчасці Янкі Купалы. У праніклівых лірычных вершах, у жыццесцвярджальных паэмах, у драматычных творах паэт падкрэсліваў, што чалавек мае права на годнае жыццё.

**2-і вядучы.** Спрадвечная мара «людзьмі звацца» вяла беларусаў у пошуках праўды, той папараць-кветкі, якая, як кажуць паданні, расцвітае ў купальскую ноч і прыносіць чалавеку шчасце.

**1-ы вядучы.** Купальскія вогнішчы. Вякамі іх нязгасны агонь ачышчальным святлом саграваў мільёны чалавечых сэрцаў і яшчэ будзе свяціць нам і нашым нашчадкам многія гады. Купальскае вогнішча асвятляла жыццёвы шлях творцы.

*Гучыць народная песня «А на Купалу сонца рана іграла».*

На сцэне гасне святло, імітуецца вогнішча, вакол якога — дзяўчаты-русалкі. Яны выконваюць павольны танец. З'яўляецца юнаку у нацыянальным адзенні з палымянай папараць-кветкай у руцэ. Ён змагаецца з русалкамі і перамагае. Дзяўчаты апускаюцца на падлогу і быццам засынаюць, а юнак чытае верш Я. Купалы «Спадчына».

Потым гучыць запіс аднайменнай песні (муз. Ігара Лучанка) у выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры».

Сцэна асвятляецца, святло паступова ярчэе ад промняў кветкі. Песня «Спадчына» змяняецца песняй «Белая Русь» (верш Уладзіміра Карызны, муз. Юрыя Семянякі), а ў гэты час юнак-паэт, які знайшоў папараць-кветку,

выводзіць за руку на сцэну дзяўчыну ў святочным убранні, з вянком на галаве. Яна сімвалізуе сабой вясну маці-радзіму, новую Беларусь.

*Янка Купала. Выйдзі...*

Ясна, святочна ў красы ўбярыся,
Птушкай свабоднай сягні ў вышыну,
З сонцам злучыся, зорамі йскрыся,
Песняй распейся, сдавай акрыйся,
Выйдзі спаткаці вясну!

Юнак звяртаецца да дзяўчыны-Беларусі.

*Янка Купала. Маладая Беларусь.*

Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў над нягодамі;
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі...

Янка Купала. Шляхам гадоў.

Дык жа шумі, красуй у волі, родны Край!
Звіні ў свой звон, сялянскі звон!
Спявай ты, Беларусь, у радасці спявай!
Твайго Народа сёння права і закон.

**2-і вядучы.** Сёння мы разумеем прычыны паэтавай маркоты, тугі і песімізму. Але якім бы жорсткім і няўмольным ні быў лес Я. Купалы ў 1930-я гады, у той жахлівы сатанінскі час, сэрца паэта не маўчала.

*Васіль Зуёнак. Зарука.*

Эпохам не грукалі ў грудзі,
Аб долі сваей не крычалі.
Казалі: «Што будзе, то будзе...»
А болей — маўчалі.
1 думка ад холаду стыне,
І часам апусцяцца рукі:
Няўжо мы крычым у пустыні?..
Ды слова ўзыходзіць зарукай!
Не будзь жа не будзь іншаверцам
На родным прычале.
Паўстань, паўстань мае сэрца,
З пустыні маўчання!

**2-і вядучы.** Пройдуць дзесяцігоддзі, і мы адкрыем для сябе новага Купалу - бунтара, які цвёрда верыў, што:

*Янка Купала. І прыйдзе...*

І прыйдзе новых пакаленняў
На наша месца грамада
Судзіці суд, ці мы сумленна
Жыццё прайшлі, ці чарада
Зняваг мінулых нас не з'ела.
Пакінуўшы свой дым і чад.

І мы па-даўняму нясмела
Жылі не ў лад і неўпапад?
Ці аб свой гонар дбайна дбалі,
І дабравольна, без прынук.
Самі сабой не гандлявалі.
Не неслі ў петлі дум і рук?
1 ці пакінуці на памяць
Мы песень гэтакіх змаглі,
3 якіх бы можна было ўцяміць.
Што мы свабоднымі былі?..

**1- ы вядучы.** Адказ на гэтае пытанне паэта дало само жыццё — падзеі 1940-х гадоў, калі на свабоду народа замахнуўся крыважэрны вораг.

Заслона закрываецца. Па-за сцэнайу у выкананні хору сцішана гучыць «Лясная песня» (верш Адама Русака, муз. Уладзіміра Алоўнікава). Паступова спевы мацнеюць, а на словах «Ды ўспомнім былыя гады» заслона адкрываецца, мелодыя гучыць цішэй. На сцэне, ля вогнішча, — вучні, апранутыя, як партызаны. Паказваюцца кадры пра Вялікую Айчынную вайну. У час паказу гучаць словы вядучага.

**2-і вядучы.** Над краінай пранёсся грозны кліч паэта. «Калі вораг сарве яблык, што паспеў у нашым садзе, то яблык разарвецца ў яго руках гранатай. Калі ён сажне жменю цяжкіх каласоў, зярняты вылецяць і паб'юць яго свінцовым дажджом. Калі ён падыдзе да нашых чыстых сцюдзёных крыніц, яны перасохнуць, каб не даць яму вады...»

*Мелодыя «Ляснай песні» гучыць мацней, але яе перапыняе чытальнік, які звяртаецца да партызан.*

*Янка Купала. Беларускім партызанам.*

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны.
Клічу вас я на пабеду,
Хай вам шчасцем свецяць дні,
Выразайце людаедаў,
Каб не стала іх і следу
На святой нашай зямлі.

Партызаны рашуча падымаюцца і пакідаюць сцэну. Мелодыя сціхае.

**1-ы вядучы.** У суровыя дні Вялікай Айчыннай вайны паэт верыў, што Беларусь не стане на калені перад ворагам.

*Янка Купала. Зноў будзем шчасце мець і волю.*

Загоім раны, адбудуем
Свае сялібы зруйнаваны,
Сваю краіну маладую
Святлом асвецім нечуваным.

**2-і вядучы.** Збыліся прарочыя словы паэта: вайна скончылася перамогай. Зноў закаласіліся беларускія палеткі, зазелянелі пушчы і дубровы, гарады і вёскі ўзняліся з руін.

*Гучыць песня «Абеліскі» (верш Міхася Ясеня, муз. Дзмітрыя Смольскага) або «Памяць сэрца» (верш Міхася Ясеня, муз. Ігара Лучанка).*

**1-ы вядучы.** Янка Купала! Сёння без яго творчасці нельга ўявіць роднай беларускай літаратуры. Без яго натхнёных вершаў, без «Кургана» і «Банлароўны», «Раскіданага гнязда» і «Паўлінкі». Яго паэзія адлюстроўвае шырокі свет чалавечых пачуццяў, паказвае сэнс людскога існавання. Янка Купала зразумеў народную праўду і панёс яе «На свет цэлы».

*Уладзімір Карызна. Пакуль ёсць Купала.*

Купала, купалле і купал нябёс,
Куванне зязюлі ля струн лозаўніцых...
Купала — Шлях Млечны птушыных бяроз,
Жывыя званы беларускіх крынічак.
Купала жыццё і час быстрацечны,
Таму й не звядзецца ніколі наш род.

**2-і вядучы.** Кожны, хто наведвае купалаўскія мясціны, не можа не захапляцца спрадвечнымі дубровамі, першародным блакітам азёр, багаццем беларускай зямлі.

*Кастусь Кірэенка. Памяці песняра.*

Толькі пачуеш: Купала, —
Толькі прамовіш: Купала,
І паўстае прад вачыма
Уся дарагая айчына.
Вітанне сонцу, што між хмар вяслуе,
Гаям, траве, падлетку-жаўруку...
Цябе, зямля Купалы, я цалую,
Як матчыну шурпатую руку.

*За сцэнай гучыць павольная, але мажорная мелодыя, пад гукі якой чытаюцца радкі.*

*Мікола Арочка. Слова да Купалы.*

Мы — на сваей зямлі...
Заўсёды дома!
Нязрушна, так!..
Хоць ёсць, вядома, рух:
Даўно нас вучыць твой, Купала, дух
Ісці праз слова — у самасвядомасць!

*Гучыць запіс песні «Янка Купала» (верш Уладзіміра Някляева, муз. Уладзіміра Будніка).*

# “НА КОЖНАЙ СЦЯЖЫНЦЫ ІХ ПЕСНЯ І ГОЛАС…”

*Літаратурна-музычная вечарына*

*Дзітлова, В. “На кожнай сцяжынцы іх песня і голас…” : літаратурна-музычная вечарына да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа / В. Дзітлова // Бібліятэка прапануе. – 2012. - № 5. – С. 10 – 16.*

*У зале падрыхтавана юбілейная выстава твораў Я. Коласа і Я. Купалы. Гучыць беларуская інструментальная музыка. На экране партрэты пісьменнікаў. З’яўляецца надпіс: «На кожнай сцяжынцы іх песня і голас». Памяшканне ўпрыгожана букетамі палявых кветак. Заходзяць тры дзяўчыны ў нацыянальных касцюмах з томікамі вершаў у руках — гэта чытальнікі. (Чытальнікам дастаткова навучыцца выразна чытаць вершы па кнізе.) Яны размяшчаюцца вакол маленькага століка. Па ходу вечарыны чытанне вершаў суправаджаецца дэманстрацыяй слайдаў з беларускімі пейзажамі.*

Выходзяць вядучыя. Музыка сціхае.

**Вядучы 1.** Кожная нацыянальная літаратура мае сваеславутыя постаці, якія сталі прызнанымі песнярамі свайго народа, яго гістарычнага лёсу. У беларусаў — гэта Янка Купала і Якуб Колас. Праз іх творы свет пазнаў жыццё беларускага народа, звычаі, гісторыю, прыгажосць беларускай прыроды. Мелодыка вершаў гэтых паэтаў заўжды прыцягвала ўвагу беларускіх кампазітараў. У песнях вершы набылі новае жыццё і разляцеліся далёка за межы Беларусі.

**Вядучы 2.** 2012 год адзначаны 130-годдзем з дня нараджэння народных песняроў. Менавіта гэтаму юбілею прысвечаны нашы літаратурныя вячоркі.

«Мне сняцца сны аб Беларусі», — пісаў Я. Купала. З багатай літаратурнай спадчыны народных песняроў мы адабралі толькі некалькі старонак — лірычныя вершы пра самыя блізкія сэрцу мясціны, вершы-летуценні, вершы, навеяныя вобразамі любых.

З паэзіяй Купалы і Коласа цесна звязана творчасць беларускага музычнага ансамбля «Песняры», песні ў іх выкананні сталі сапраўднымі шлягерамі.

На сярэдзіну сцэны выходзіць чытальнік з кнігай, пачынае чытаць верш «Спадчына» (1 куплет).

***Чытальнік 1.***

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў

Яна мне ласкай матчынай...

*Гучыць фанаграма песні «Спадчына» на сл. Я. Купалы ў выкананні «Песняроў».*

***Чытальнік 2.*** Паэт Сяргей Грахоўскі прысвяціў Янку Купалу верш, які так і называецца «Ідзе Купала па зямлі»:

Белаю чаромхавай завеяй
Зноў пялёсткі бераг замялі,
Зноў у полі жыта палавее,
І Купала ходзіць па зямлі.
Ходзіць па снягах і па расе,
Заначуе ў полі або ў хаце, —
Ён такую спадчыну нясе,
Што не можна ні забыць, ні страціць.
Спадчына — адзіны запавет,
Спадчына — усіх асноў аснова,
І нясе цераз вякі паэт
Матчына няскоранае слова.

**Вядучы 1.** У далёкім 1910 годзе Максім Горкі пісаў у лісце да сябра: «У Беларусі ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя хлопцы! Так проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым бы крышку гэтых якасцей! Вось бы добра было б!»

**Вядучы 2.** Лірыка Якуба Коласа — гэта сама Беларусь. У яго паэзіі, як у Нёмане, адлюстравана ўся беларуская зямля.

Чытальнік 3.

Высокі Бераг, родны, мілы!
Люблю я твой пясчаны скат
І хвоек нізкіх гурт пахілы,
Капцоў гранічных цэлы рад.
Люблю той лес, што над табою
Высока ўзняў свае камлі;
Яго ж карэнні над вадою
Нібы вянок табе сплялі...
Струменіць Нёман срэбраводны
Ў тваіх прыўдалых берагах,
А ў лозах ветрык вее згодны,
І ходзіць шум па чаратах.
Высокі Бераг, кут мой мілы!
Люблю я жоўць тваіх пяскоў,
Разложных хвоек гурт пахілы
І ціхі гоман лазнякоў.

Я. Колас «Высокі бераг»

**Вядучы 1.** Рыгор Барадулін піша: «Паэзія Якуба Коласа з ласкавымі прымусамі запрашае за стол беларускасці, каб і госць разам з гаспадарамі

хмялеў ад беларускага слова, сэрца звесяляў спеўнымі гукамі, якія йдуць з грудзей Беларусі».

***Чытальнік 1.***

На ўсходзе неба грае
Пераліўным блескам,
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.
Чуць-чуць дрогне, прыліецца
Чырвань на ўсходзе –
Гэта неба ўсміхнецца
Людзям і прыродзе.
Урывак з верша Я. Коласа «Усход сонца»

*Гучыць песня на сл. Я. Коласа «Радасць» у выкананні Дзяржаўнага народнага хору.*

**Вядучы 2.** Кожны, хто хоць раз сугыкаўся з творчасцю Якуба Коласа, зведаў уздзеянне непаўторнасці і прыгажосці яго слова, адчуў напеўнасць і надзвычайную музычнасць яго вершаў.

Вось як характарызаваў паэзію Коласа Народны артыст Беларусі Рыгор Шырма: «У яго вершах такія звароты і вобразы, такія яркія праўдзівыя малюнкі беларускай прыроды, што здаецца складаў іх сам народ. Яго паэзія шчырая, як сама народная песня».

***Чытальнік 2.***

Прайшоў Вялікаднік свяценькі.
Бяруцца людзі за сявенькі,
За плуг, за бораны, за сохі,
Пайшлі разгульвацца патрохі.
Запахла поле зноў раллёю;
Гракі, вароны чарадою
За свежай ходзяць баразною.
Вясёлы шум і пануканне
Чутны да самага змяркання.
А над палямі ў ясным небе,
Як быццам песнямі аб хлебе,
Які даручан гэтай глебе,
Зальюцца жаваранкі хорам,
І песні моўкнуць па-над борам.
Урывак з паэмы «Новая зямля»

*Гучыць фанаграма песні «Мой родны кут» у выкананні «Песняроў».*

**Вядучы 1.** Улетку 1912 года адбылася першая сустрэча Якуба Коласа і Янкі Купалы. Яны пазнаёміліся на радзіме Коласа — на хутары Смольня, недалёка ад вёскі Мікалаеўшчына. З той пары і на ўсё жыццё паміж імі завязалася моцная дружба.

**Вядучы 2.** Блізкія па светапогляду, Купала і Колас з самага пачатку і да канца свайго творчага жыцця валодалі непадобнымі паэтычнымі галасамі з розным дыяпазонам і сілай пачуцця.

Паэзія Купалы, такая блізкая да Коласаўскай, убірае ў сябе не толькі сацыяльныя матывы, але і самыя інтымныя рухі чалавечай душы. Паслухайце перліну лірыкі Купалы, натхнёную яго пазнейшым каханнем да актрысы Паўліны Мядзёлкі, верш «А яна...»

***Чытальнік 3.***

*А яна...*

Гэткім шчырым каханнем яе атуліў,
З гэткай ласкай глядзеў у яе сумныя вочы, —
Як і сонца не туліць расквечаных ніў
Як і зоры людзям не ўглядаюцца ўночы!
Так пясціў так галубіў галубку, яе,
Так цяпліў сваім сэрцам сірочым ёй грудзі, —
Як і маці не песціць дзіцё — як спаўе,
Як і вогнішча ззябнутых грэці не будзе!
Столькі песень над песнямі ёй я напеў,
Столькі думак злажыў аб ёй важных, таёмных, —
Як і бор гэтак з ветрам шумець не шумеў
Як і век гэткіх дум не злажыў для патомных!
Гэткі ў сэрцы сваім збудаваў ёй пасад
І такую ўзлажыў ёй з кахання карону, —
Як і неба з зямлёю, на божы загад,
Не прыдбаюць такіх ні кароны, ні трону!
Так услявіў яе ў славу сонца і зор,
Так маліўся дзень-ноч к ёй мальбою нябёсаў —
Як і мудрасць не ўславіць усясвету прастор,
Як і каня не моліцца ўлеткуда росаў!
Утварыў з яе шчасце з-над шчасцяў сваё –
Чарадзейную княжну з аповесці дзіўнай,
І пад ногі ёй кінуў жыццё сваё ўсё...
А яна?.. А яна была толькі... дзяўчына!..

*Гучыць песня «Не глядзі на мяне», сл.Я. Купалы ў выкананні «Песняроў».*

**Вядучы 1.** Песні Купалы — гэта люстэрка, у якім адбіваецца душа беларуса.

*Песні Купалы!*

Іх спявалі дзяўчаты натхнёна,
з душой,
Ім падпявалі хлопцы басіста.
Мне здавалася, што я кветку
шчасця знайшоў
Пад напеў задушэўна-ўрачысты...

П. Пруднікаў «Песні Купалы»

*Гучыць песня «Явар і каліна», сл. Я. Купалы ў выкананні «Песняроў».*

**Вядучы 2.** Летам 1935 года Я. Колас адпачываў у вёсцы Загібелька пад Талькай. Гэтае лета было надзвычай плённым. Ён піша шэраг вершаў, парадкуе свае запісы аб паездцы ў Францыю. Паездка ў Парыж і наведванне лепшага еўрапейскага курорта Бадэн-Бадэн яшчэ больш узмацнілі пачуцці Коласа да беларускай зямлі.

***Чытальнік 1.***

Быць можа, я крыху дзівак,
Але люблю я Загібельку:
Там кожны хвойнік мне сваяк,
Там ясным днём надрэчны гак
Мне суліць мяккую пасцельку.
Зірнеш на дол — убогі ён,
Адзін пясок, сухі, нішчымны,
Ды колькі тут наткаў красён
Чаборык, мох, зязюльчын лён
І верасок агніста-дымны!
А вось і возера-акно,
Якога мала дзе пабачыш,
Такое дзікае яно
Сярод балоцішча адно, —
Завуць яго чамусь Грымячым.
Калі агледзіш хвайнякі
І гэты кут пазнаеш бліжай,
Збіраючы баравікі, —
То вывад я раблю такі:
Мне Загібелька лепш Парыжа.

Верш Я. Коласа «Загібелька» прысвечана К. Крапіве)

**Вядучы 1.** Беларусь багатая вельмі прыгожымі мясцінамі. Прырода роднага краю заставалася на працягу ўсяго жыцця жыватворнай крыніцай творчага натхнення.

***Чытальнік 2.***

Вось старая хатка,
Садзік невялічкі.
Малады алешнік
Па краях крынічкі.
З краю лес высокі;
Тут жа, каля хаты,
Дзве старыя вербы,
Дуб каржакаваты.
Ў пералівах кветак
Ззяе луг зялёны,
Луг шырокі, пышны,

Як бы цар у кароне.
Далей, за лугамі,
Легла поле кругам,
Зрэзана сахамі,
Баранамі, плугам.
Зелянеюць межы
Вузкія, як стужкі,
Дзе-нідзе чарнеюць
Між загонаў грушкі...

Верш Я. Коласа «Старая хатка»

**Вядучы 2.** Чытаючы вершы Я. Коласа, мы то пераносімся на квітнеючы краскамі луг, то на гарачы пясчаны бераг ласкавай ракі з празрыстымі хвалямі, то ў лес з яго сонечнымі зайчыкамі на палянах. Адна карціна змяняецца другой. Прачытаеш — і сам пранікаешся любоўю да кожнага дрэўца і травінкі.

***Чытальнік 3.***

Люблю я прыволле
Шырокіх палёў
Зялёнае мора
Ржаных каласоў.
І вузкія стужкі
Сялянскіх палос –
Люблю цябе, поле,
Люблю я твой плёс!
Ігрушы старыя,
Што ў жыце шумяць,
Зялёныя межы,
Далёкую гладзь.
Люблю я дарогі,
Што леглі між гор,
Ўнізе пад гарою
Ручча разгавор.
Люблю я ўзгоркі,
І насып-курган,
І сіняй далечы
Празрысты туман...
Люблю пазіраць я
На поле вясной,
Як ветрык жартліва
Плыве збажыной.
Калышацца жыта,
Радамі бяжыць,
А хваля паветра
Дрыжыць і дрыжыць…

Люблю я прыволле
Шырокіх палёў,
Зялёнае мора
Буйных каласоў.

Верш Я. Коласа «На полі вясною»

**Вядучы 1.** Лірыка Коласа — летапіс людскіх настрояў і імкненняў, трапяткія пачуцці закаханых, першыя словы кахання.

Гучыць песня на сл. Я. Коласа «Каханне» ў выкананні «Песняроў».

**Вядучы 2.** Уявіце цёплы чэрвеньскі поўдзень: травы яшчэ не скошаны, пяшчотны ветрык калыша духмяныя кветкі, над лугам пах мёду...

***Чытальнік 1.***

Добра ў лузе ў час палудны!
Лёгка там дыхнуць!
Хмаркі белыя марудна
За лясы плывуць.
Ветрык краскі чуць калыша,
Травы шалясцяць,
Луг зялёны жыццем дыша –
Конікі трашчаць.
У лозах шчэбет не сціхае,
Шум стаіць і свіст,
Ў яркім бляску спачывае
На ракіце ліст.
Спевам-гоманам і звонам
Поўніцца ўвесь луг,
І дрыжыць над ім, зялёным,
Жыватворчы дух.

Верш Я. Коласа «На лузе»

**Вядучы 1.** Беларусь — край блакітных азёраў і векавых пушчаў. Лес заўжды шчыра служыў беларусу: хаваў ад ворагу ў ліхую гадзіну, надзяляў улетку і па восені сваімі пладамі, выклікаў да летуценняў і адпачынку пад цяністымі волатамі-дубамі.

***Чытальнік 2.***

*З апавядання «Сірата Юрка».*

«Маладая раслінка стаяла ў полі. Стары лес закрываў яе ад паўночных вятроў і даваў ёй цяпло і зацішак. Яна была такая маленькая, такая нязначная, што ніхто нават не пазіраў на яе і не цешыўся ёю, нягледзячы на тое, што гэтае маленькае стварэнне выяўляла сабою асобны кут жыцця, разумна і замыславата зроблены. Па праўдзе сказаць, з першага погляду трудна было пазнаць, што гэта за штука, і толькі прывычнае вока магло пазнаць, што гэтая раслінка стане з часам дрэвам, тым заўсёды зялёным дрэвам, што завецца хвояю».

***Чытальнік 3.***

Калі бывае мне маркотна, —

А я маркочуся часцей,
Як гэта думае ахвотна
Мой дабрадзей ці ліхадзей, —
Тады іду я ў лес нядбала,
Каб не мазоліць воч людзям,
На мох валюся дзе папала,
І ўжо я з пушчай сам-насам.
Ніхто не бачыць і не чуе,
Аб чым тут гутарку вяду,
Дзе думка днюе і начуе,
Сваю хавае дзе нуду.

Верш Я. Купалы «У лесе»

**Вядучы 2.** У сваім вершы Янка Купала марыць пра адзіноту. Ён прыходзіць у лес, каб застацца адзін на адзін са сваімі думкамі.

А Якуб Колас зварочваецца да лесу як да старэйшага таварыша, ён удзячны лесу за першыя ўрокі прыгажосці.

***Чытальнік 1.***

З маленства люблю я лясы,
Іх сцішаны голас і шум патаёмны,
І пушчы глухія, а ў іх бураломы,
Дзе ветры гудзелі пад гулкія громы
Ды слалі дажджоў абрусы.
Вучыў мяне лес пазнаваць
Прыгоства, суладнасць і чары прыроды,
Дзе птаства спраўляе штогод карагоды,
Дзе тояць крыніцы празрыстыя воды
Для рэчак, каб край умываць.
Ой, лес, беларускі наш лес!
Я песень за век свой злажыў табе многа,
У свет праз цябе мне ляжала дарога,
Ты песціў юнацкасць, і цешыць старога
Сягоння твой полаг-навес.

Верш Я. Коласа «Лясам Беларусі»

**Вядучы 1.** Лясная сцяжынка вабіць усё далей і далей. І раптам гушчар раступаецца — і, як у казцы, перад вачыма чароўная гладзь ляснога возера.

***Чытальнік 2.***

Дрэмле абсаджана лесам адвечным,
Цінай засланае возера ў лесе;
Шастае ціха асока і аер,
Нудныя казкі куст з кустам шапоча.
Сосны і вязы, дубы і асіны
Вакола возера вартай пасталі,
Долу ківаюць паклоны нямыя,
Небу малітву таемную твораць.

Возера! Возера! Йду к табе смутны
Соннаю пушчай, амшалаю сцежкай, —
Жоўтае лісце шасціць пад нагамі,
Шчокі калючка сасновая шчыпле.
Сам з сабой насам пад дубам саджуся, —
Вочы і думкі пабеглі далёка...
Сцішна над возерам, воблачна ў небе...
Недзе запелі ўзвіжанне гусі.

Верш Я. Купалы «Лясное возера»

*Гучыць павольная ціхая мелодыя.*

**Вядучы 2.** Неўзабаве, разам з лёгкім павуціннем у лесе з'яўляецца задуменная восень з яе ранішнімі туманамі, з павольным кружэннем лісцяў, з грыбным пахам.

***Чытальнік 3.***

Не шасцяць каласы,
Звон не валіцца з касы,
Не кладуцца ў стог пласты,
Толькі сыплюцца лісты
На яловыя кусты,
На сухія верасы.
Не іскрыцца небазор,
Не цвіце трава-чабор,
Не цыгліць птушыны стан,
Толькі поўзае туман,
Вецер б'е ў нямы курган, —
Шапаціць імглісты бор.
Змога вольная снуе,
Вочы ўставіўшы свае,
То галубне, то пужне.
Сэрца б'ецца ў паўсне,
Думка сэрцу аб вясне
Здрадны голас падае.

Верш Я. Купалы «Адцвітанне»

**Вядучы 1.** Лёгкі восеньскі смутак спрыяе паэтычнаму настрою, нездарма так любяць восень паэты.

*Гучыць песня на сл. Я. Купалы «Не глядзі» ў выкананні «Песняроў».*

**Вядучы 2.** Мабыць, кожны з нас хоць раз у жыцці бачыў у восеньскім небе жураўліны клін. Гэта незабыўнае відовішча: крыху казачнае, крыху сумнае, нібы разам з птушкамі ад нас адлятае часцінка нашага жыцця, і з намі застаюцца толькі ўспаміны.

*Ціха гучыць сумная мелодыя.*

***Чытальнік 1.***

Белыя валокны
Сцелюцца над долам.

Не спяваюць птушкі,
Сціхнуў лесу шолам.
Сцелюцца валокны,
Тчэцца павуціна –
Блізка, блізка восень,
Смутная часіна!
Зажурыцца неба,
Схованае ў хмары,
І агорнуць сэрца
Нейкі жаль і мары.
Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі.
Стомленасць, знямеласць...
Тояць думку боры...
Шш! Што то за гукі
Чуюцца ў прасторы?
Жаласна-прыгожа
Льюцца ў небе гукі,
Слухаюць лясы іх,
Луг, балота, лукі.
У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі на вырай
Мкнуцца над лясочкам.
Меньшыцца шнурочак,
У паднеб'і тае,
Вось ледзь-ледзь чарнее,
Міг — і прападае.
І стаіш ты, смутны,
Доўга пазіраеш,
Як бы нешта страціў,
А што — сам не знаеш.
Так у час расстання
З тым, хто сэрцу любы,
Адчуваеш смутак
Цяжкай страты-згубы.
І глядзіш маўкліва
На дарожку тую,
Што нясе ўдалечу
Душу дарагую.

Верш Я. Коласа «Адлёт жураўлёў»

**Вядучы 1.** Вось і канчаецца наша лірычнае падарожжа. Разам з вамі мы нагадалі любімыя з дзяцінства радкі, пас- лухалі цудоўныя песні.

*На развітанне — некалькі радкоў Пятруся Броўкі:*
Зямля Беларусі, зялёныя долы!
З крыніц тваіх чыстых пад шумнай вярбой,
Зачэрпнулі думы Купала і Колас,
З тваёю журбой і ўцехай тваёй;
На кожнай сцяжынцы іх песня і голас.

# Сцэнарыі па творчасці Максіма Танка



## НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКІХ ЗМЕН

*Літаратурна-музычная кампазіцыя*

*Сцэнарый да юбілею М. Танка [Электронны рэсурс] // Маладзечанская РЦБС ім. М. Багдановіча. – Рэжым доступу : http://molib.by/index.php?p=for_librarians. - Дата доступу : 15.11.2016.*

*Гучыць беларуская народная песня “Купалінка”. На сцэне столік і два крэслы, у абрамленні вышываных ручнікоў, вісіць партрэт Максіма Танка.*

**І Вядучы:** Я сустракаюся з імі позіркам амаль штодня (калі не бываю ў ад’ездзе), а то і двойчы, і тройчы на дзень: яны свецяцца з кніжнай паліцы сонечна-медзянай цеплынёй, стаяць грунтоўна, плячом да пляча – тамы Збору твораў Максіма Танка, - як нарачанскія сосны.

**ІІ Вядучы:** Я слухаю іх дыханне. Чую зялёны пошум кронаў, векавы звон прасмаленых стрыжняў, ціхую, упартую, жыццядайную працу каранёў.

**І Вядучы:** Я чую душу паэта. Яна – у кожным радку. Яна – як і “дзіўная родная мова” – вытканая:

***Чытальнік:***

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор’яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго…

**І Вядучы:** Мова і душа паэта, што першасней, што вышэй?А можа, гэта - адно? Запісана ў Кнізе Кніг: спачатку было слова. А душа? Той дух, тая сіла касмічная, усясветная, якая ўдыхнула ў чалавечыя вусны Слова? Слова без душы? Душа без слова? Іх нельга, іх немагчыма раз’яднаць

**II Вядучы:** Слова прарока – яго душа. А паколькі паэт – хоць трошкі ды прарок, а паэзія (калі яна сапраўдная, а не сімуляцыя словам) - хоць трошкі ды прароцтва, то адзінства гэтае тут замацавана тройчы, трыма хрэснымі знакамі.

**I Вядучы:** Бо слова ратуе душу, а душа ратуе слова.

**II Вядучы:** І толькі што згаданы верш аб роднай мове быў прамоўлены Максімам Танкам таксама на мяжы жыцця і смерці: у 1943 годзе, калі на Беларусі палыхала крывавае зарыва вайны. Паэт глыбінна адчуў тую неспатоленую сілу, якая ўратуе народ, узніме яго, з'яднае і дапаможа выстаяць перад любою навалай, - родная мова, душа яго – шчыт і надзея.

**I Вядучы:** Ідзе няўмольны яго вялікасць – час і правярае літаратуру, паэзію на вечнасць. Але найперш яна правяраецца сэрцам чытача, сэрцам чалавечым. Уладзімір Караткевіч, наш беларускі апостал, выбіраючы спадарожнікаў жыцця, назваў – побач з паэзіяй Купалы, Коласа, Багдановіча – паэзію Панчанкі і Танка.

**II Вядучы:** Бо паэзія Танка неўміручая, як і гэты верш, які зараз прагучыць.

***Чытальнік:***

Толькі перад зярном,
Што прагне каласіцца,
Перад жалезам,
Што жыць на зямлі памагае,
Перад калясом,
Што развозіць песні і гасцінцы,
Перад іголкай,
Што мяхі і дружбу сшывае,
Перад дарогай,
Што вядзе да сонца,
Перад птушкай,
Што помніць дрэвы свайго гаю,
Перад вадой,
Што не замярзае ў палонцы,
Перад чалавекам,
Што праўды шукае, –
Будучыня.

**I Вядучы:** "На этапах" – з кнігаю пад такой назвай выйшаў у літаратурны свет Максім Танк. Яе шчырым, захопленым словам вітаў выдатны знаўца, збіральнік і ахоўнік роднай песні Рыгор Раманавіч Шырма.

**II Вядучы:** "…гэтая маладая паэзія такая блізкая і зразумелая нам…ад яе вее свежым пахам чорных скібаў паднятай зямлі, сталёвым адгалоскам звонкай касы, свежым подыхам ветру з-пад Нарачы, які спрадвеку "палошчыць кашулю-дзяругу" нашай этапнай Беларусі,"- пісаў ён у прадмове да першай кнігі паэта.

**І Вядучы:** Так, гэта былі этапы. Этапы заходнебеларускага вязня Лукішскай турмы, этапы да ўз’яднання шматпакутнай Беларусі, разрэзанай крывавай мяжой, навязанай беларускаму народу чужой воляй і чужымі мэтамі.

**ІІ Вядучы:** Этапы на шляху народа і этапы на шляху паэта – іх нямала зазнаў, і жыццёвых, і літаратурных, Максім Танк. Былі дні горкія, былі дні радасныя. Але ніколі не было здрадных народным ідэалам.

**І Вядучы:** Куды б ні прыводзіў, куды б ні закідваў лёс паэта – ён заўсёды і ва ўсім заставаўся тым простым нарачанскім хлопцам, верным сынам сваёй маці – Беларусі.

***Чытальнік:***

Забудуцца нягоды, ліхалецці,
Зноў заквітнеюць вёсны на палях,
І толькі, можа, аб мінулым вецер
Ды сосны прашумяць на курганах.
Задрэмле вечар казкай старой маткі,
Закаласіцца ніў маіх прастор;
Рассее ночка ў небе сінім гладкім
З каўша свайго мільёны светлых зор.
І я дамоў, хоць зморaны вярнуся,
Каб маладую змену прывітаць,
Каб свае песні роднай Беларусі
І прыдарожным соснам перадаць.

**ІІ Вядучы:** Шчаслівы той, хто сустрэўся з паэзіяй Максіма Танка. Мнагакрат шчаслівейшы, каму выпала сустрэцца з самім паэтам.

**І Вядучы:** Яго натура літаральна выпраменьвае паэзію. У сяброўскай гамонцы, на пасяджэнні ці ў нейкім прэзідыуме сыпаў і сыпаў ён гатовымі паэтычнымі находкамі, як зернем са шчодрай жмені. І колькі было ў іх гумару і дасціпу! Як вось у гэтым, класічна вядомым вершы “Партрэт друга”:

***Чытальнік:***

Не адзін пуд солі разам з’елі мы,
Не адну цыгарку выкурылі мы,
Не адна атака апаліла нас,
Не адна песня падружыла нас.
А прыслаў партрэт мне, і я ледзь пазнаў –
Хто цябе, мой дружа, так пашанаваў?!

**І Вядучы:** У стыхіі роднага слова паэзія Максіма Танка пачувае сябе нязмушана і вольна – ад узорна–адчаканеных рытмаў да рамантычнага, неўтаймоўнага, але падуладнага аўтарскай задуме верлібра. Услухаемся:

***Чытальнік:*** “Шум-гул у дуброве, звон-пыл на гасцінцы” – гэта едзе свята песні, едуць хлопцы і дзяўчаты; а гэта: “Люблю твая, Нарач, затокі і тоні, як вецер густыя туманы развесіць…”- гэта ўлоўленае слыхам паэта і ўзноўленае словам гайданне, мерны раскалых нарачанскае хвалі, што набліжае нас да гучання антычнага гекзаметра…

**II Вядучы:** Паэзія не толькі сведчанне. Паэзія – гэта і прадчуванне. І таму, чаму не згадаць верша, які стаў прадвеснікам таго гарлахвацкага прагматызму, таго цынізму, які так выразна прадэманстраваў наш час, наш век.

***Чытальнік:*** Пахнуць пераспелыя суніцы.
Чую подых кожнага лістка.
Чую, як духмяная ігліца
Ападае з голляў сасняка.
Чую, як міжзорныя ракеты
Пралятаюць недзе нада мной…
Можа, мы – апошнія паэты,
Што вось так любуюцца зямлёй…

**І Вядучы:** Паэзія Максіма Танка – уся ад зямлі, ад лёсу людскога. Адна ўжо назва яго кніг гучыць як песня жыцця. Згадалая ўжо – “На этапах”, а потым: “Журавінавы цвет”,”Праз вогненны небасхіл”,” На камні, жалезе і золаце”,”Мой хлеб надзённы”,”Глыток вады”,”Дарога, закалыханая жытам…”

**II Вядучы:** Таму і ідзём мы той дарогай, дарогай Паэта, дарогай, закалыханай жытам…

**І Вядучы:** А дарога тая не канчаецца, бо за даляглядам адкрываецца яшчэ адзін далягляд, а за ім – наступны…

**II Вядучы:** Бо паэзія – гэта лёс паэта. Ёсць у яго дзень нараджэння і дзень адыходу з жыцця, астатняе ўсё у вершах. І разумеючы гэта, іншыя вершаробы імкнуцца штучна “зрабіць” сабе біяграфію ( то ён запісваецца ў геолагі, то падаецца ў кітабоі, то да сталявараў), каб займець, а то і перахапіць больш-менш спакусныя, “прэстыжныя” паэтычныя, ці , дакладней тэматычныя , дзялянкі.

**І Вядучы:** Максіму Танку не было патрэбы кідацца ў захады па штучнаму “стварэнню” біяграфіі. Яе пісала само жыццё -“на камні, жалезе і золаце,” – як трапна засведчана назваю адной з яго паэтычных кніг.

**І Вядучы:** Нарадзіўся паэт 17 верасня 1912 года ў вёсцы Пількаўшчына, на Мядзельшчыне, - у цудоўным азёрным Нарачанскім краі…

**II Вядучы:** З дзіцячых гадоў пазнаў цану і мудрасць сялянскай лусты хлеба, бо зерне падала не на камень…

**І Вядучы:** А потым было знаёмства з іншымі жыццёвымі камянямі: не толькі тымі, што ляглі акордам ў арганную песню віленскай Вострай брамы, але і ў змрочныя муры Лукішскага астрога, куды трапіў юнак-падпольшчык Жэня Скурко па волі польскай дэфензівы.

**II Вядучы:** Адсюль, праз жалезныя краты, прарывалася бунтарскае слова маладога паэта.”Паслухайце, вясна ідзе” – усклікнуў аднойчы вязень, пабачаўшы праз акенца – шчыліну, як расцвіў на турэмным двары куст бэзу. І ў воклічы гэтым была не толькі вестка, але і надзея, і заклік змагання за волю:

Я ціха разбудзіў другіх.

Ад слёз сінелі вочы бэзам.
І недзе хруснула ў худых
Руках іржавае жалеза.

**І Вядучы:** Сялянскі жарт , а разам з ім хлебаробскую шчырасць, шчодрасць і прастату пранёс Максім Танк праз усё жыццё. Якія б творчыя ці грамадскія вышыні – а іх было нямала: Народны паэт, акадэмік, Герой Працы, лаўрэат шматлікіх прэмій, якія б ушанаванні ні ўзнімалі Максіма Танка, ён заўсёды заставаўся верным па-сапраўднаму філасофскай – хоць, здаецца на першы позірк, простай выснове свайго дзеда Хведара: "Які чалавек, такія і сны…"- быццам пра паэзію было сказана, а хутчэй за ўсё што і так, бо словы мовіліся, калі ўнук Жэня сядзеў за сталом і штосьці занатоўваў. То і канкрэтызуем, як кажуць, следам за дзедам: "Які чалавек, такая і паэзія…"

**І Вядучы:** Таму і стараўся, каб на жыццёвай дарозе ўзрасталі і выспявалі такія эстэтычныя прынцыпы, якія б максімальна нагадвалі б жыццёвыя."Сапраўдная паэзія, - быў перакананы Максім Танк, - пачынаецца не ад слоўнай і рытмічнай эквілібрыстыкі, але ад думкі." І прызнаваўся: "Стараюся пазбегнуць таннай патэтыкі і позы…"

**ІІ Вядучы:** Сувязь з роднай зямлёй, глыбокія карані высока ўзносяць крону паэзіі Максіма Танка. І яна таго заслугоўвае.

**І Вядучы:** Але пры ўсёй сваёй маштабнасці паэзія Максіма Танка не выглядае, аднак, гэткай планетарна-безаблічнай: яна засяроджана і клопатна, з сардэчнай цеплынёй і спагадай углядаецца ў лёс канкрэтнага чалавека, - і хіба можа спакойна пачувацца паэт, калі зямля робіцца бяднейшай хаця б "на адно людское шчасце?.."

***Чытальнік:***

Заўсёды вабілі мяне
Нябёс прасторы,
Ды прыпазніўся я , відаць,
Ляцець да зораў.
Таму часцей вандрую я
У сусвет лірычны,
У глыб душы, якая ў нас
Не менш касмічнай…

**ІІ Вядучы:** І ў звязку з гэтым нельга не згадаць "геніяльную слязінку" Дастаеўскага, словы яго Івана Карамазава:"…ад найвышэйшай гармоніі я назусім адмаўляюся. Не вартае яна слязінкі хаця б аднаго толькі таго закатаванага дзіцяці…"

**І Вядучы:** Сапраўдная паэзія – як неба, як зямля: яны не просяць несмяротнасці, - яны ёсць, яны будуць. Хораша сказаў украінскі паэт Дзмітро Гнацюк: "паэт – гэта вялікі дух, гэта малітва, гэта выразнік вечных каштоўнасцяў…"

**ІІ Вядучы:** Паэзія Максіма Танка – не толькі пранікнёнае выяўленне сучаснай явы, але і прарочы позірк у заўтрашні дзень чалавецтва, пошук

будучыні, духоўна ўзвышаны, асветлены спрадвечнымі ідэаламі гуманізму. І ў гэтым – зарука яе прывабнасці і жыццядзейнасці на новых рубяжах гісторыі, у справах і душах новых пакаленяў.

**І Вядучы:** Бо як напісаў паэт:

Ёсць адна песня песняў –
Пра Радзіму
І ніхто не знае,
Хто яе пачаў,
І ніхто не знае,
Хто і калі яе закончыць…

# Я СЭРЦАМ ПІСАЎ СВАЮ КОЖНУЮ ПЕСНЮ

*Літаратурна-музычная імпрэза*

*Бутучак, Г. Я сэрцам пісаў сваю кожную песню : літаратурна-музычная імпрэза да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка / Г. Бутучак // Бібліятэка прапануе. – 2012. - № 6. – С. 10–16.*

*Кніжная выстава «Жыццёвыя і творчыя пуцявіны Максіма Танка. На століку — партрэт Максіма Танка, букет кветак, раскрыты зборнік вершаў паэта. Побач цытата: “Не ведалі гэткага Танка ніколі ні вёска, ні горад” (Антон Бялевіч).*

*Гучыць песня «А што гэта за даліна», муз. В. Шабаліна.*

***Чытальнік 1.***

Не толькі ўзяў таму я гэту мову,
Што на ёй рэкі, пушчы гаманілі,
Шумелі ў полі каласы і травы,
Пераклікаліся па гнёздах птушкі,
Што з ёю лёгка было стаць чым хочаш –
Пявучай скрыпкай,
жаўруком,
паэтам.
Я гэту мову ўзяў сабе таму, што
Зашмат у ёй было гаротных песень,
І мне хацелася прынесці болей
Ёй чалавечай радасці і сонца.
Таму цяжэй мне, як другім, калісьці
На гэтай мове стаць было паэтам.

1962

**Вядучы 1.** Яго паэзія — не толькі наша гісторыя. Яна актыўна прысутнічае і будзе прысутнічаць у нацыянальным літаратурным працэсе. «І кожнае наступнае пакаленне будзе знаходзіць, будзе браць з Яе нешта новае, адкрываць сваю старонкулюбові да Яе. Гэта ўжо як дотык вечнасці...» (Р. Баравікова).

Сын Яна і Дамінікі з Хвалькоў Яўген Скурко — такое сапраўднае прозвішча Максіма Танка — нарадзіўся 17 верасня 1912 года ў вёсцы Пількаўшчына на Мядзельшчыне, у цудоўным азёрным Нарачанскім краі.

У вершы «Да аўтабіяграфіі» паэт, згадваючы вядомы біблейскі сюжэт, з гумарам распавёў пра сваё, далёка не ўрачыстае, зусім будзённае, з’яўленне на свет:

Ніякая віфлеемаўская зорка,
Ніякая планіда
Не абвяшчалі
Аб маім прыходзе на свет,
Як не абвяшчалі
Аб з'яўленні
Ніводнага з мужыкоў.
Толькі, — апавядала маці, —
Пачуўшы мой крык,
Світанак адклікнуўся пеўнем
Ды пратрубіла рабая карова,
Якую спазніліся выгнаць на пашу.

**Вядучы 2.** Хто ведае, ці не былі лёсавызначальнымі ранішні спеў вясковага пеўня і трубны голас рабой каровы?! Можа, згодна з Божай воляй, гэтыя знакі і сталіся прызнаннем немаўляці сваім у сялянскім асяродку? Ці не перадаў тады певень яму натхненне, а рабая карова ці не стала сімвалам нялёгкага жыццёвага шляху, на якім хапала як светлага, так і цёмнага колераў?

***Чытальнік 2.***

Дзень залаты
Цёплым сонцам заліты,
Лётаў матыль
Сінякрылы над жытам.
Лётаў, як сон,
Над калоссямі нізка,
Як перазвон,
Над малою калыскай.
Слёзы мігцяць
Ад тугі і бяссілля, —
Хоча дзіця
Дакрануцца да крылляў.
Маці-жняя
Пацяшае малога:
— Доля твая
Яшчэ спіць на дарогах.
Я вось дажну
Паласу, сіраціна,
І раскажу
Пра палёт матыліны.
Будзеш і ты,
Сынку, лётаць высока.
Вось зараблю
Я на хлеб табе, сокал.

Матыль. 1937

**Вядучы 1.** «Узначальваў» сям'ю Скуркоў дзед паэта — Фёдар Маркавіч, заядлы паляўнічы. Сыны хадзілі на заробкі ў лес, былі плытагонамі. Аднак калі пачалася Першая сусветная вайна, мусілі пакінуць «родны кут», пайсці ваяваць. А калі фронт прыйшоў на Мядзельшчыну, у бежанства падалася і маці паэта. Яна апынулася ў Маскве, дзе «служыла прыбіральшчыцай у сям'і нейкага палкоўніка, пазней — у «папа», а затым пайшла працаваць на ваенны завод. Тут працаваў і бацька паэта, якога перавялі ў Маскву як «майстравога».

«Жыць прыйшлося недзе ў Ціхвінскім завулку, у нейкім падвале, з вакна якога, — гаворыць Максім Танк,— я мог бачыць толькі ногі прахожых. Помню, аднойчы разбудзіў мяне грукат грузавікоў. Я выбег на вуліцу і ўпершыню пачуў слова «рэвалюцыя».

**Вядучы 2.** У школу хлапчука аддалі на год раней тэрміну, каб ён «не перашкаджаў суседзям ідома». Тут будучы паэт пазнаёміўся з творамі выдатных рускіх пісьменнікаў. «Першая кніга, якая зрабіла на мяне незабыўнае ўражанне,— прыгадвае ён,— была кніга М. Гогаля «Вечары на хутары ля Дзіканькі» і яго аповесць «Тарас Бульба». Потым — Пушкін, Лермантаў, Някрасаў».

На радзіму бацькі паэта вярнуліся ў 1922 годзе, калі Беларусь ужо была падзелена на Усходнюю і Заходнюю. Першую зіму хлопец сядзеў дома, вучыў польскую грамату, каб потым паступіць у школу.

У пачатковай школе ў Шкленікаве гаварыць па-беларуску забаранялася. «Вінаватых нейкі Г. Бурэк, прыехаўшы з Пазнані, біў лінейках па руках,— прыгадвае паэт.— Дваццаць год так польскія каланізатары выкарчоўвалі нашу мову, апалячвалі наш край. Усё ж, не зважаючы на нішто, мы адчувалі сябе беларусамі».

**Вядучы 1.** Скончыўшы польскую пачатковую школу, Яўген Скурко з 1926 года працягваў вучобу ў рускай гімназіі ў Вілейцы, затым — у Радашковіцкай беларускай гімназіі. З апошняй яго выключылі за ўдзел у школьнай забастоўцы, накіраванай супраць ліквідацыі беларускіх школ польскім урадам.

Калі няма на свеце маёй мовы,
Майго народа і мяне самога, —
Дык для каго будуеце панове,
Канцлагеры, катоўні і астрогі?
Супроць каго рыхтуеце расправы
І шыбеніцы ўзносіце пад хмары,
Штодня арганізуеце аблавы
І ўсіх мабілізуеце жандараў?
Супроць каго рыхтуеце вы змовы
З прадажнымі іюдамі і з Богам, —
Калі няма на свеце маёй мовы,
Майго народа і мяне самога!

1931

**Вядучы 2.** Першае блізкае знаёмства з паліцыянтамі адбылося ў красавіку 1932 года. Паэта арыштавалі за супрацоўніцтва ў легальным і нелегальным камуністычным друку Заходняй Беларусі. Пазней яму давялося добра зведаць усе тыя жахі, якімі сустракалі турэмныя казематы сваіх вязняў.

У Лукішскай турме, аб якой паэт трапна зазначыў, што тут «ні на міг не спынялася жыццё і барацьба, вучоба і барацьба», Максім Танк паспеў выпусціць шэсць нумароў «Кратаў». Пасля яго часопіс рэдагавалі іншыя пісьменнікі, якія займалі месца вызваленых таварышаў.

***Чытальнік 1.***

І зноў я тут, сярод муроў,
Паміж астрожных сцен праклятых.
І рвуцца думкі-сны ізноў
На волю — за драты і краты,
Туды, дзе ў ззянні летніх зор
Пра жніво думаюць калоссі,
І будзяць задрамаўшы бор
Далёкім бразгатам калёсы.
І дзе на прызбе, пад акном,
Старыя пра жыццё гавораць,
Як жыць нялёгка мазалём
І як ім хлеб батрацкі горак.
Заўжды там гутаркі адны:
Жылі з няволяй, не зжыліся...
І месяц ціха з-за сасны
Глядзіць на вёску баючыся.
А я тут зноў сярод муроў,
Паміж астрожных сцен праклятых!
І рвуцца думкі-сны ізноў
На волю — за драты і краты.

І зноў я тут. 1934

**Вядучы 1.** Адказваючы на пытанне, чаму выбраў такі незвычайны псеўданім, паэт месцамі не без жартоўнай усмешкі гаварыў: «Ну, Максім — гэта ад Горкага, пад уплывам якога мы ўсе тады знаходзіліся. А Танк... нават сам не магу добра растлумачыць: чаму Танк? Як многім пачынаючым паэтам, мне здавалася, што літаратурны поспех залежыць і ад гучнага псеўданіма. Свет «раслінных» псеўданімаў быў ужо, што называецца, разабраны: Колас, Чарот, Пушча, Васілёк... Мне нічога не заставалася, як пашукаць што-небудзь «жалезнае», вось я і спыніўся на Танку». З другой нагоды аўтар зазначаў, што ў слове «танк» яму чулася нешта «магутнае, сталёвае, дынамічнае, адпаведнае... рытму і трывожнаму характару часу».

**Вядучы 2.** Найбольш раннія з вядомых нам твораў Максіма Танка адносяцца да 1931-1933 гадоў. У 1936 годзе выйшла першая кніга Максіма Танка пад назвай «На этапах». Яе шчырым, захопленым словам вітаў

выдатны знаўца, збіральнік і ахоўнік роднай песні Рыгор Раманавіч Шырма:«... гэтая маладая паэзія такая блізкая і зразумелая нам ... ад яе вее свежым пахам чорных скібаў паднятай зямлі, сталёвымі адгалоскамі звонкай касы, свежым подыхам ветру з Нарачы, які спрадвеку «палошчыць кашулю-дзяругу» нашай этапнай Беларусі».

*Гучыць песня «Спакойна дрэмле Нарач», муз. Ю. Семянякі.*

**Вядучы 1.** Максім Танк у заходнебеларускай паэзіі з'яўляецца найбольш яркім прадстаўніком рамантызму, «паэзіі барацьбы і змагання», да якой таксама належаць Валянцін Таўлай, Міхась Васілёк, Піліп Пястрак і інш. Нацыянальна-вызваленчыя матывы складаюць ідэйна-тэматычную аснову зборнікаў 30-х гадоў «На этапах», «Журавінавы цвет», «Пад мачтай». Вершы і паэмы, якія ўвайшлі ў гэтыя зборнікі, сталіся лепшымі ў заходнебеларускай паэзіі.

Разам з тым прыкметнае месца ў зборніках паэта займае прыродаапісальная паэзія.

За шэрым схіленым парканам
Скрыпіць пясок сырых дарог,
Спадае медны ліст каштанаў
На жоўты стоптаны мурог.
Ідзеш, яго рукамі ловіш, —
Злавіўшы, пусціш, хай ляціць, —
Зноў не шумець яму ў дуброве,
Вясенніх шолахаў не піць.
І сумаваць яшчэ так рана,
Калі ўдаль маніць сцежак гладзь,
Калі на шум лясны ў тумане
Умееш песняй адказаць,
Калі так хочацца смяяцца,
Што бачыш ты і чуеш ты,
Як ціха сыплюцца праз пальцы
Каштанаў звонкія лісты.

Лісце каштанаў. 1937

*Гучыць песня «Лясок», муз. Т. Дзядзюлі.*

**Вядучы 2.** Куды б ні прыводзіў, куды б ні закідваў лёс паэта — ён заўсёды і ва ўсім заставаўся тым, нарачанскім хлопцам.

Люблю тваё, Нарач, затокі і тоні,
Як вецер густыя туманы развесіць.
Ці снежная пена на хвалях зазвоніць,
Цалуючы зоры, калышучы месяц.
Люблю, калі ў сонцы гарыш пазалотай,
Раскінуўшы сінія хваляў палотны,
Калі ў непагоду сумуеш маркотна
З рыбацкаю песняй, з зялёным чаротам.
Люблю твае буры, твае навальніцы.

Ў іх чую, бы ў песнях, жыццё маладое.
І хочацца блізка грудзьмі прытуліцца
Да чорных ад гневу кіпучых прыбояў.

1937

**Вядучы 1.** Вялікая Айчынная вайна застала пісьменніка ў Беластоку. Апошнім цягнікам яму з сям'ёй удалося выехаць на Усход, у Саратаўскую вобласць. Адсюль паэт пайшоў на працу ў франтавую газету «За Савецкую Беларусь», якая прызначалася для беларускага насельніцтва і закідвалася ў нямецкі тыл на самалётах. У зборніках «Вастрыце зброю» і «Праз вогненны небасхіл» галоўнае месца займаюць ваенныя матывы, вобразы паланёнай роднай зямлі і Беларусі-змагаркі.

*Гучыць песня «Клубамі чорны дым віўся», муз.А. Багатырова, і песня «Два арлы», муз. Г. Вагнера.*

***Чытальнік 2.***

На ўзгорку крутым партызан паміраў
На ўзгорку, дзе вецер шуміць.
Там воран, прысеўшы, пра раны пытаў:
— Каторая болей баліць?
— Што раны мае! — адказаў партызан. –
Іх боль хутка згасне з зарой.
Век будзе крывавіць цяжэйшая з ран –
У сэрцы матулі маёй.
Таму я прашу цябе, воран, калі
Ў маёй будзеш ты старане,
Дзе кожнай вясной расцвітаюць палі,
Старой не кажы пра мяне.
Хай думае лепш, што здароў я і жыў
Што, пэўна, сяброўку знайшоў
Што я ажаніўся, пра дом свой забыў,
Таму не пішу ёй лістоў.

На ўзгорку. 1954

*Гучыць песня «Пасылае маці думы», муз.В. Шабаліна.*

**Вядучы 2.** З цягам часу ў паэзію Максіма Танка ўваходзіць лірыка-філасофскі роздум. Верш «Родная мова» — гэта твор глыбокага духоўна-патрыятычнага зместу, які ўспрымаецца як гімн роднаму слову. Мова паўстае як вялікая сіла нацыянальнага выратавання.

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —

Ты выткана, родная мова...

**Вядучы 1.** Тэматычна-вобразны дыяпазон паэзіі Максіма Танка надзвычай шматгранны. Яго хвалюе ўсё, што звязана з лёсам чалавека, роднай зямлі, мінулым нашага народа, балючымі праблемамі грамадства і чалавецтва. Пра што б ні пісаў Максім Танк, ён застаецца паэтам філасофскага погляду на свет...

Усё мае працяг жыцця:
Нітка — у туга навітым клубку,
Дарога — у імкненні за небасхіл,
Песня — у водгаласах рэха,
Зерне — у хлебе надзённым,
Любоў — у сонечнай усмешцы дзіцяці:
Усё мае свой працяг жыцця,
Апроч няпраўды.

Чытальнік 1.
Зямля трымаецца на трох сланах,
Сланы — на велізарнай чарапасе,
Чарапаха — на голубе,
Голуб — на хлебным коласе,
Колас — на калысцы,
А калыска — на песні матчынай...
І пакуль песня будзе гучаць,
Калыска будзе калыхацца,
Зерне — прарастаць,
Голуб — віць гняздо пад страхой,
Чарапаха — ісці Млечным Шляхам,
Сланы — пераступаць з нагі на нагу, —
Зямля будзе век
Зелянець, зелянець, зелянець...

Касмалогія. 1968

**Вядучы 2.**
Паэт разважае пра шчасце...
Простае шчасце людское,
Так як і наша з табою,
Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабранага ў полі,
З поту, дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,
З дружбы, мацнейшай ад смерці,
З песні... І так мне здаецца:
Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б яно шчасцем.

Шчасце. 1960

*Гучыць песня «Мой хлеб надзённы», муз. Эдзі Тырманд.*

**Вядучы 1.** Сувязь з роднай зямлёй, глыбокія карані высока ўзносяць крону паэзіі Максіма Танка ад песеннай душы, ад казак і легенд народа.

Я не прашу сабе спагады,
Ні ўзнагароды і ні ўлады.
Дай толькі ты маёй краіне
Мір і спакой пад небам сінім,
На бацькоўскай страсе — буслянку,
Шыпшынавы куст — каля ганку,
Калоссе шчодрае — на ніве,
Напеваў родных пералівы,
А ў засені дубровы недзе,
Дзе спяць мае бацькі, суседзі, —
Хоць непрыкметную мясціну
Свайму тулягу адпачынак.
За што гатоў я свой аўтограф
Паставіць пад любы цыраграф.

Літанія. 1991

**Вядучы 1.** Станаўленне Максіма Танка як паэта адбывалася ўсё ж такі ў першую чаргу пад зоркаю народнай песні, якая надзвычай шчодра свяціла юнаку на пачатку творчага шляху.

У выключна народнай традыцыі пабудаваны жартаўлівыя песні «На камарыным вяселлі» на музыкуАнатоля Кос-Анатольскага і «Анэтка» на музыку Гаўрыіла Юдзіна.

*Гучыць песня «На камарыным вяселлі», муз. А. Кос-Анатольскага.*

***Чытальнік 2.***

Калі закончыў Бог
Сваю работу
І збіраўся ўжо на адпачынак,
Да яго прыйшоў
Адам са скаргай,
Што сонца зусім не грэе,
Вада — не ўталяе смагі,
Хлеб — горкі,
Птушкі — безгалосыя,
Травы — чэрствыя,
Кветкі — недухмяныя,
Дні — сумныя,
Ночы — бяссонныя.
І Бог
Стварыў жанчыну.
І толькі дзякуючы ёй
Стала можна жыць
На зямлі.

Жанчына. 1989

***Чытальнік 1.***
Не сячы сасны, бо пахіліцца,
Не муці ракі — вір уздымецца,
Не тапчы вясны — цвет асыпецца,
Не журы дачкі, бо пакрыўдзіцца.
Немагчыма ёй, звонкай, маладой,
Прапусціць было стрэчу над ракой,
Вечар ласкавы, ноч з сваёй красой,
Гэту раніцу з майскаю зарой.
Як не слухаць ёй гоману ў палях,
Пераздвону хваль, песень салаўя,
Што гавораць ёй неба і зямля,
Голас мілага: “Зорка ты мая…”
Бо нашто тады ёй красу дала,
Белы тварык мыць на расу вяла,
І аб шчасці ёй песні ты гула,
Як маленькаю ды яна была?
Не сячы сасны, бо пахіліцца,
Не муці ракі — вір уздымецца,
Не тапчы вясны — цвет асыпецца,
Не журы дачкі, бо пакрыўдзіцца.

Не сячы сасны. 1955

*Гучыць песня «У садочку май», муз.Д. Лукаса.*

**Вядучы 1.** Адзін з шэдэўраў паэзіі Танка — «Ave Maria». Гэта паэтычнае маленне на паўнакроўнасць духоўнага і зямнога, пазбаўленых усялякіх пут прыняволяння і аскетызму. Паэт прывёз верш з турыстычнага падарожжа па краінах Еўропы, з Італіі. Там ён сустрэў сямнаццацігадовую прыгажуню-манашку. Яшчэ ў Вільні Максім Танк бачыў, як нерухома стаяць манашкі перад крыжам Пятровым. Паэт ведаў, на што асуджае чалавека манаская сутана,— і ў ім нараджаўся пратэст, які выліўся ў верш вялікай эмацыйнай сілы. Назва верша невыпадковая. Ave Maria — адна з галоўных малітваў (вядомая з XI ст.) у набажэнстве хрысціян — у католікаў яна другая пасля Ойча наш.

*Гучыць песня « Ave Maria », муз.А. Фляркоўскага, або В. Іванова ў аранжыроўцы У. Мулявіна.*

**Вядучы 2.** Асаблівае месца ў лірыцы Максіма Танка займае тэма кахання. Вершы пра каханне, напісаныя цягам усяго жыцця, сталі каштоўным набыткам беларускай паэзіі.

***Чытальнік 2.***
Нашто ты косы заплятаеш,
У танцы кружыш агнявым,
Нашто каралі прымяраеш
Перад люстэркам нежывым?
Яно маўчыць, яно не можа

І сотай долі перадаць,
Як выглядаеш ты прыгожа,
Як вочы зорамі гараць.
Ты лепш пакліч мяне, красуня,
Хоць на хвіліну да сябе,
І мне не будзе гэтак сумна,
І я дапамагу табе
Прымерыць стужкі, завушнічкі,
І плечы хусткай ахінуць,
І лакавыя чаравічкі
Перад «Лявоніхай» абуць.
Ты ўсё мне даравaць не можаш,
Што, першы раз як памагаў
Караляў шнур неасцярожна
Рукой няўмелаю парваў.

Нашто ты косы заплятаеш. 1955

*Гучыць песня «Завушніцы», муз. У. Мулявіна.*

***Чытальнік 1.***

Я атрымаў тваё пісьмо,
Але яго не раскрываю,
Бо не вярнуцца з пепла зноў
Да намі страчанага раю.
Хто вінават — дарма судзіць:
Ці я, Адам, ці ты мо, Ева.
Ці той, хто ў садзе пасадзіў
Знарок спакусліваe дрэва.
Хоць і сягоння цябе сню,
На шчасце страціўшы надзею.
Я аддаў пісьмо агню,
У якім гару і папялею.

1988

**Вядучы 1.** Паэт дакладна перадае душэўна- псіхалагічны стан закаханых, нярэдка піша пра іх паводзіны з цёплым гумарам:

Ты не ўгаворвай лепш мяне!
Няма сягоння часу мне
Глядзець, як лёд рака ўзрывае,
А то вось раззлуюся я.
Яшчэ не жонка я твая, —
Шмат вёсен у запасе маю!
Ды невядома, што і як
Лепш апрануць у гэткі вечар.
А мне не трэба твой пінжак,
Сабе яго накінь на плечы!
А гразь якая! І няма

Дзе абысці разоры, лужы.
Пусці! Я перайду сама,
Не клапаціся, мілы дружа!
І не нясі, і не мілуй,
Ато з дарогі лёгка збіцца.
І асцярожна! Не цалуй!..
Ну, як з табою не сварыцца!
Сварка. 1955

**Вядучы 1.** Прататыпам гераіні лірыкі кахання Максіма Танка з'яўляецца Любоў Андрэеўна Асаевіч, жонка, надзейная спадарожніца жыцця.

Яны пазналіся яшчэ тым часам, калі малады творца, што называецца, толькі спрабаваў паэтычныя магчымасці, калі ягоны талент толькі пачынаў набірацца чытацкіх сімпатый, а слову было дужэць ды дужэць. Было гэта ў далёкія 30-я гады...

***Чытальнік 2.***
Калі б можна так зрабіць, каб твае дарогі
Ды праходзілі заўжды ля майго парога,
Каб вячэрняю парой мне гасцінна дзверы
Адчыняла ты заўжды, клікала вячэраць,
І прысеўшы за сталом, так, як гэта трэба,
Мы дзяліліся з табою радасцю і хлебам,
І даверыла б маім ты рукам, дзяўчына,
Ў час начны аберагаць сон твой і спачынак,
І даверыла б яшчэ кожнай раніцою
Пацалункамі будзіць і вітаць з зарою, —
Я адмовіўся б тады ад сяброў і чаркі,
Ад гармоніка свайго, дымнае цыгаркі,
Ад вандроўнага жыцця, што душа кахала...
Ты смяешся... Адкажы: можа гэта мала?
*Гучыць песня «Анэтка», муз. Г. Юдзіна.*

***Чытальнік 1.***
Не крыўдуй на весні вецер,
Што цябе разбудзіў на дасвецці, —
Гэта я яму падказаў.
Не крыўдуй на сонца, якое
Цябе расцалавала зарою, —
Гэта я яго папрасіў.
Не крыўдуй, што жаўрук рана
Цябе выклікаў выйсці на ганак, —
Гэта я яго паслаў.
Бо без цябе я не знаю:
Ці была б у мяне такая
Непаўторная вясна?               1981

**Вядучы 2.** З тых часін, наколькі дазвалялі магчымасці, яна рупілася аб яго ахайным вонкавым самапачуцці і ўнутранай самадастатковасці: упадала душою ў ягоныя клопаты і праблемы, ахоўвала спакой. Паэт быў звязаны з ёю настолькі, што, здавалася, залежаў ледзь не ва ўсім. Хораша сведчаць пра гэта старонкі яго «Дзённікаў». «Быў у кардыялагічным цэнтры. Думаў там легчы на рамонт, бо з кожным днём чуюся ўсё горш. Амаль нічога не засталося з былога майго аптымізму. Ледзь хаджу, трымаючыся за дзве спадніцы — жонкі і паэзіі».

*Гучыць песня «Ты мяне любіш», муз. У. Мулявіна.*

**Вядучы 1.** Вядома, у іх жыцці здаралася рознае. Але адпушчаны ім Усявышнім час яны правялі ў падкрэсленай павазе і ўзаемаразуменні, любові і згодзе: «Добры дзень, мой дарагі Жэнька. Здаецца ўжо прайшла цэлая вечнасць, як мы з табой не бачыліся. Страшэнна сумна і адзінока, хаця кругом шумяць унукі і кожны дзень напоўнены living рознымі справамі...».

***Чытальнік 2.***

— Дзень добры, маці! Не пазналі?
А я — аднасяльчанін, свой,
Сын Тэклі. З ёй вы сябравалі,
З маёю зналіся раднёй.
Каторы сын? Марцін, сярэдні.
Вы на маім вяселлі нат
Сядзелі за сталом бяседным,
Пець падахвочвалі дзяўчат.
А жонка хто? З сям'і Дзям'яна,
Што лепш за ўсіх сярпы зубіў.
Яе засваталі за Яна,
Але яму я перабіў,
Вярнуў запоіны, гасцінцы.
Вы, пэўна, помніце, як ён
Пачаў быў на вяселлі біцца,
Ледзь госця выпрасілі вон.
Не помніце?.. Я ж той, што лазіў
У сад па яблыкі да вас...
— Дык што ж, сынок, ты мне адразу
Не прыгадаў пра гэты час!
Цяпер я знаю... Божа мілы!
Якім жа ты быў хлапчуком!
Рваў яблыкі... -
І пагразіла
Сваім бярозавым кійком,
Як быццам бы не даравала
Мне за даўнейшыя грахі.
І сцежкаю павандравала
Збіраць траву ў барах глухіх,

Траву ад розных ран глыбокіх,
Ад дум, што камянём гнятуць,
І ад вачэй, і ад урокаў,
Што спаць начамі не даюць.
І як я не спытаў не знаю,
Калі яе стрэў ля сяла,
Ці ёсць трава ў яе такая,
Каб маладосць вярнуць магла?

Сустрэча. 1956

**Вядучы 2.** На схіле жыцця Максім Танк вяртаўся ў думках у мінулае, пражытае, асэнсоўваў зведанае і ўбачанае на пуцявінах веку. Назва апошняй кнігі «Errata» якраз і азначае «заўважаныя памылкі». Паэт ставіўся да сябе ранейшага крытычна, не баяўся прызнаць памылкі. Ён быў сапраўдным Майстрам, стварыў таленавітую паэзію.

Гартаючы
Жыцця свайго старонкі,
Шмат бачу
Дат,
падзей,
імён,
То выкрасленых
Некалі цэнзурай,
То спаленых
Агнём выратавальным...
Таму хацелася б
Да эпілога —
Калі паспею —
Дапісаць эрату
І вены перарваныя
Злучыць.

**Вядучы 1.** А які быў Максім Танк як чалавек? Адказваючы на гэта пытанне, Іван Навуменка адзначаў: «Вельмі добры, шчыры, зычлівы, я проста не ведаю іншага такога. Калі Танк бачыў, што чалавек хоць трошкі нечага варты, ён яго падтрымліваў. І так ён падтрымліваў вельмі многіх. Ён нікому не рабіў зла. Пражыць жыццё і нікому не наступіць на нагу — гэта таксама талент. Прытым ён не быў беспрынцыповым, яго заўсёды вызначала пазіцыя, прынцыповасць...».

**Вядучы 2.** А сын Максім Яўгенавіч успамінае, што бацька захапляўся шахматамі, більярдам, гарадкамі і, асабліва, картамі. «Гэтага вам не пераказаць! Ён, відаць, мог бы быць чэмпіёнам Беларусі па прэферансе (яны называлі «пулька»). У нас дома гулялі суткамі. Аркадзь Куляшоў, Кандрат Крапіва, Пімен Панчанка, Максім Танк, часам Максім Лужанін... Практычна не адрываліся ад стала. Маці прыносіла есці прама за іх стол. Жонкі званілі, шукалі іх, а яны ні на што не звярталі ўвагі. І бацька амаль заўсёды

выйграваў. Прычым кожны раз гэта суправаджалася такім смехам, што за квартал можна было пачуць. Так ён рагатаў. Ён вельмі добра помніў карты. Не было ў яго памяці на тэлефоны, прозвішчы і імёны людзей, а на карты была».

**Вядучы 1.** Максім Танк пражыў вялікае жыццё, прымусіўшы за дзесяцігоддзі сумленнай і плённай працы паважаць сябе і старых і маладых, і левых і правых. Яго нельга не паважаць, ім немагчыма не захапляцца. Чалавечы і творчы дар яго ад Бога, ён усеабдымны, чысты і светлы, дасканалы.

Калі ў хлебе
Больш сілы, як хлеба,
Калі ў віне
Больш хмелю, як віна,
Калі ў агні
Больш цяпла, як агню,
А ў застоллі
Больш сяброў, як застолля, —
Пара пачынаць песню.
Калі ў хлебе
Больш хлеба, як сілы,
Калі ў віне
Больш віна, як хмелю,
Калі ў агні
Больш агню, як цяпла,
А ў застоллі
Больш застолля, як сяброў, —
Пара канчаць песню.

Калі... 1980

*Гучыць песня «Няма сцежкі карацейшай», муз. Д. Смольскага.*

# Сцэнарыі па творчасці Пімена Панчанкі



## КАБ КОЖНЫ ПАНЧАНКУ ПАЧУЎ

*Вусны часопіс*

*Садоўская, Л. Каб кожны Панчанку пачуў : вусны часопіс / Л. Садоўская, Т. Нішчык // Бібліятэка прапануе. – 2012. - № 2. – С. 2–5.*

*Гучыць беларуская народная мелодыя.*
*Музыка паступова сціхваецца.*

**Вядучы 1.**
Я стаю, гады свае гартаю,
І сціскае сэрца нейкі боль,
Быццам я на Месяц адлятаю,
Быццам я лугоў не ўбачу больш.
Не, не развітаюся ніколі
З родным краем, дзе так светла нам.
Проста я люблю яго да болю
І з любоўю дзецям перадам.

**Бібліятэкар.** Народны паэт Беларусі Пімен Панчанка ўжо ніколі сам не зможа перагарнуць старонкі свайго жыцця. Давайце зробім гэта мы, бо і як творца, і як чалавек Пімен Панчанка ўяўляе сабой асобу, зносіны з якой здольны ўзбагаціць любога чалавека. Мы парупіліся пра тое, каб паэт больш гаварыў сам, сваімі вершаванымі радкамі.

На экране - паслядоўна здымкі Пімена Панчанкі, пачынаючы з яго партрэтаў у вайсковай вопратцы з кнігі «Дзе начуе жаўранак» (Мінск, 1982)

### Старонка 1.
### «ЗГАДВАЮЧЫ ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ»

**Вядучая 1.**
Тады ўспамінаецца ўсё да драбніц,

Што звязана з родным краем, -
Як жыта шуміць, як агонь зарніц
На дне азёр дагарае.
Як летам спякотным за днямі дні
Ішлі па іржышчы калючым...
Мы ранілі ногі аб камяні,
І нам не было балюча.
І не было нічога ярчэй
За сонца на родным небе,
І не было нічога смачней
Матчынага хлеба.
**Вядучы 2.**
Вада з прыдарожнага ручая
Была саладзей за мёд нам...
Краіна мая, маці мая,
Час твой цяжкі і гаротны!
Топча, катуе тваю зямлю
Вылюдак ашалелы.
Я кроўда апошняй кроплі пралью,
Каб толькі табе палягчэла.
**Вядучы 1.**
Веру цвёрда: сканае бязлітасны вораг,
І штандар перамогі над краем
запаліць зару.
Пакуль сонца не згасне,
Пакуль свецяцца зоры,
Беларусь не загіне,
Будзе жыць Беларусь!
**Вядучы 2.**
Бой пад вечар скончыўся,
А мы ўсё пра атаку,
Хоць былі ўжо «тыл».
І ніхто яшчэ з нас не памыўся,
І ніхто яшчэ з нас не астыў.
І ляжаць сябры ў магіле брацкай –
У каманды пахавальнай многа спраў.
Не спяшаў камбат пісаць аб стратах,
Аб сваіх салдатах гараваў.
Кроіў хлеб мой друг рукою чорнай,
З гімнасцёркі не абмыўшы кроў.
Выпівалі па чатыры нормы –
Нашы і загінуўшых сяброў.
**Вядучы 1.**
Франтавікі старэць не маюць права,

І колькі там гадоў не набяжыць,
А нашы твары, як і нашы справы,
Заўсёды будуць маладымі жыць.
Бо іх такімі - з добраю ўсмешкай –
Запомнілі гісторыя і час,
І тыя палькі юныя і чэшкі,
Што ў сорак пятым абдымалі нас...
А хто не паспрыяў людскому шчасцю,
Каго і сёння гне халуйскі страх,
Дык той не франтавік, не нашай часці,
А недзе акалачваўся ў тылах.
**Вядучы 2.**
Я вывучаў Еўропу не турыстам,
Ратуючы яе, ішоў на смерць,
Поўз па гразі, па кручах камяністых,
Каб на зямлі сяброў сумленных мець.

## Старонка 2.
## «З ДАЛЁКІХ ВАНДРОВАК»

*Гучыць мелодыя «Сіртакі».*
**Вядучы 1.**
Я не магу мінуць Элады –
Пачатак міфаў спрэчак, дум.
І - хай нам рады ці не рады –
Я на Акропаль узыйду.
Цывілізацыі калыска,
Гекзаметраў густы настой!
Антычны свет - а нам ён блізкі
Сваёю мудрай прастатой.
*Гучыць фрагмент песні «Санта Лючыя».*
**Вядучы 2.**
Сёння ў Капры плывём на адведкі.
Як па масле ідзе параход.
Чарнавокія нашы суседкі –
Малады і прыгожы народ.
Італьянскія словы вучылі,
Каб з дзяўчатамі пагаварыць.
Пелі дружна мы «Санта Лючыю»,
«Падмаскоўныя вечары».
*Гучыць іспанская мелодыя.*
**Вядучы 1.**
Згубіўся ўдалечы Афрыкі след,
Развеяўся цень Гібралтара...
Я раптам пачуў перастук кастаньет
І звон задуменнай гітары.

**Вядучы 2.**
Я крычу: кантыненты,
Нянавісцю воды не пеньце,
Працягніце адзін да другога
Вы рукі мастоў,
Каб ішлі да арабаў
Без танкаў, без куль еўрапейцы,
Каб арабы без крыўды
У Еўропу ішлі да братоў.
*Гучыць руская народная мелодыя.*
**Вядучы 1.**
Якая ты бязмежная, Расія!
Тайга, і стэп, і цішыня, і гул...
Палкоў сібірскіх ведаем мы сілу,
Братоў імёны ў сэрцы берагу.
Шчаслівы я, што ўбачыць давялося
І Енісей, і хараство Саян,
Як там плыве ракою жоўтай восень
У цёмны і далёкі акіян.
*Гучыць музыка Ф. Шапэна.*
**Вядучы 2.**
Мы ім пра Хатынь,
А яны пра Катынь...
Факты ў нас і ў вас,
А праўда - у Бога.
Набалелае сэрца,
Супакойся, астынь:
Вінаваціць не трэба
Адзін другога.
Не мы расстрэльвалі
Польскіх афіцэраў палонных,
Не вы спапялялі
Ў той час Хатынскіх сялян.
Пад пасёлкам Леніна
Мы ў суседніх
Ішлі батальёнах,
Прага волі, свабоды
Навек параднілa ўсіх нас...
А тыя парадніліся
Ў крыві і гразі
Недаравальным
Пякельным грэхам:
Крывавы арыец
І крывавы грузін...

А да нас далятае
Расстрэлаў тых рэха.

## Старонка 3.
## «ЭКАЛАГІЧНЫЯ КЛОПАТЫ ПАЭТА»

**Вядучы 1.**
Паглядзіш - і камяк у горле:
Парадзеў і збяднеў наш бор,
І блакітную скуру здзёрлі
Дзе-нідзе з нашых рэк і азёр:
Леглі плямы мазуту і нафты,
Бруд сцякае з усіх бакоў.
Як там птушкам пяецца?
**Вядучы 2.** Не надта.
**Вядучы 1.** Як там рыбы?
**Вядучая 2.** Спытай рыбакоў.
**Вядучы 1.**
Смерць лясоў для мяне непрымальна,
Як і гібель павольная рэк...
Людзі, людзі, жывіце нармальна
І пра будучы думайце век.
**Вядучы 2.**
Не нудны прарок я і не прапаведнік...
Ды сэрца трывожна гудзе: «Не маўчы».
Зямля наша - самы святы запаведнік –
І трэба, як маці, яе берагчы.
**Вядучы 1.**
Калі звар’яцелы да рэчкі паўзці
Ты будзеш у вогненнай поўсці,
Ты думаць не станеш, што мудрасць спасціг,
Ты марыць не будзеш камусьці адпомсціць.
Забудзеш усё, як пачнецца садом,
Забудзеш пра славу, і грошы, і рэчы,
Пакінеш багаццем напоўнены дом:
Да рэчкі, да рэчкі, да рэчкі!
Туды, дзе купаўся і плаваў не раз,
Шпурляў на траву прапацелую куртку
І мыў свой мазутны забруджаны МАЗ,
Пляваў у раку,
Кідаў злосна акуркі...
**Вядучы 2.**
На глупства мы трацілі безліч гадзін.
І дзе той набытак?
І дзе чалавечнасць?
Пякельны канец,

І ва ўсіх ён адзін.
Мы сыта жылі
І не дбалі пра вечнасць!..
**Вядучы 1.**
З зямлі драпежнага разбою
Даносіцца пагрозны шум.
Ратуйце, людзі, усё жывое,
Ратуйце ўласную душу.
**Вядучы 2.**
Абрабаваная зямля майго маленства
Аж да апошняе сірочае слязы...
Дзе жыта каля лесу
І дзе лес той?
Ні жаўранкаў, ні сонца, ні расы.
**Вядучы 1.**
Не люблю я слова «пакарыцель»,
Не люблю я слова «уладар»,
Вось зямля зялёная - бярыце
Для жыцця, і працы, і для мар.
Хто ўладарыць, той і ўдарыць раптам –
Па надзеі, па душы жывой.
Пакарэнне пахне трохі рабствам,
Карай, і рабункам, і крывёй...
**Вядучы 2.**
Акіян і космас вывучайце
З добрым сэрцам,
А яшчэ прашу:
Пакідайце і буслу, і чайцы
Больш вады і неба на душу.
Вядучая 3.
Дае прырода зноў урокі нам:
Не верце цішыні, салодкім снам,
Бяда і радасць ходзяць побач вечна,
Людзей ратуе толькі чалавечнасць.

## Старонка 4.
## «ТОЛЬКІ Б ПАХАВАЦЬ УСЁ НАЙГОРШАЕ»

**Вядучы 1.**
Той дзень прапаў і страчаны навекі,
Калі ты не зрабіў таго, што мог;
Калі не паспрыяў ты чалавеку,
Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.
Той дзень збяднеў зліняў на сотню радуг
І, попелам пасыпаны, сканаў
Калі не падзяліў з суседам радасць

І больш за дзень узяў ты, чым аддаў.

**Вядучы 2.**
Праўда веку!
Зрабі нас дужымі,
Рабства знішчыць дапамажы:
Рабства жонкі і рабства мужа,
Рабства дачаў і аўтамашын;
Рабства чаркі, паперкі, блату,
Біркі званняў і крэслы чынуш.
**Вядучы 1.**
А страціць годнасць - невыносна,
Які б ні быў там дабрадзей...
Глядзіце знізу ўверх на сосны,
На воблакі.
Не на людзей.
А калі вас уздыме слава,
Аб гэтым думайце радзей...
Глядзіце зверху ўніз на травы
Ці на ваду.
Не на людзей.
**Вядучы 2.**
Даверлівая прастадушнасць,
Знікай - табе кажу цяпер.
Я вызваляюся ад дружбы
І ад падманлівых папер.
Былы мой друг зрабіўся жмотам,
Прыварак чэрпае густы.
Ірву яго старыя фота,
Палю няшчырыя лісты.
Не гіне род майстроў нажывы...
Чытаем па-беларуску
А я малюся аб адным:
Не дай мне, Божа, стаць ілжывым,
Зайздросным, злосным і старым.
**Вядучы 1.**
Кажуць, трэба ствараць чалавека
Адмысловага, новага, спрытнага,
Каб ішоў ён упоравень з векам,
Не губляўся ў паскораных рытмах.
Гадавала ў змаганні эпоха нас,
Гора мелі, а не барышы...
Назіраю на спрытных спалохана:
Дзе сумленне, дзе іскрыдушы?

**Вядучы 2.**
Кожны лічыць сябе разумным,
Хітрым і прабіўным, падкаваным.
А мне з імі чамусьці сумна:
Самаўпэўненая ўладкаванасць.
Малады, энергічны, сярдзіты,
Змалку ўсё патрабуеш, браток.
Ты заслоніш дзяцей ад бандытаў?
Аддасі свой апошні глыток?
**Вядучы 1.**
Што ж, ствараць нам не забаронена,
Хай надзеі ніколі не гаснуць...
Сам я сэрцам навекі пароднены
З тым салдатам,
Што ў Брэсце змагаўся.
Не шукаў жа баец той пагібелі,
Ён і раны, і голад цярпеў.
Лепшых з лепшых на фронце павыбілі,
Вось такіх бы нам болей цяпер!
**Вядучы 2.**
Не спявай мне песню пра арэлі
І пра сон дзяўчыны на зары...
Азвярэлі людзі, азвярэлі,
Вы даруйце, добрыя звяры.
Не знаёмы вам злачынцаў сродкі:
Трэба толькі ежа вам, не кроў...
Б’юць жанчын цяжарных,
Рэжуць глоткі,
Забіваюць, п’яныя, бацькоў...
**Вядучы 1.**
Ад нявер’я і тугі не плачу,
Веру:
Дабрыня людская ёсць –
Толькі ў працы з поўнаю аддачай,
І ў каханні шчырым і гарачым,
І ў вачах даверлівых дзіцячых,
Дзе яшчэ не начавала злосць.

**Бібліятэкар.** Ёсць крытэрый, які беспамылкова вызначае якасць вершаў. Дастаткова сёння пагартаць любы зборнік твораў Пімена Панчанкі, каб адчуць, якая гэта сучасная, таленавітая, глыбокая і гарачая паэзія.

# АБ ЖЫЦЦІ, АБ ЛЮДЗЯХ, АБ САБЕ

*Вусны часопіс*

*Садоўская, Л. Аб жыцці, аб людзях, аб сабе : вусны часопіс, прысвечаны Пімену Панчанку / Л. Садоўская, Т. Нішчык // Бібліятэка прапануе. – 2012. - № 3. – С. 6–8.*

**Старонка 1.**
**“БЕЗ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ НЕ БУДЗЕ І ВЕЧНАСЦІ”.**

**Вядучы 1.**Толькі часам, выракшыся тлуму,
Ношу год адчуўшы на гарбе,
Не пашкодзіць сёння нам падумаць
Аб жыцці, аб людзях, аб сабе...
**Вядучы 2.**Дабрадушны я
Альбо сярдзіты,
Весела бывае
Ці невесела —
Я штодня
Мяняю гнеў на літасць, —
То маё прызванне
І прафесія.
Пакаўзнецца
Нехта незнарок,
Наламае дроў
З малога розуму,
Будзе хай урок,
А не курок,
і не трэба
Прыгавору грознага.
**Вядучы 1.**Прагнасць,
Зайздрасць
Ненавісны мне,
Колькі імі
Душ людскіх знявечана.
Я змякчу прысуд,
Калі на дне
Нешта засталося чалавечае.
П’янае дзікунства
І паклёп,
Гвалтаванне,
Цёмнае грабежніцтва,

Падхалімства подлае
Ўзахлёб —
Ім заўсёды
Кара непазбежная.
**Вядучы 2.**
Пажаўцелі бярозы,
Чырванеюць кляны.
Ты мне сэрца пагрозна
Не кляні, а крані.
Ты шукаеш удачы,
Ды шукаеш дарма:
У бацькоў маіх дачы
І машыны няма.
Адвячоркам і ўранні
Мне крычыш: «Адчыні!»
Я шукаю кахання
І людской дабрыні.
І павагі, і ласкі,
І сяброўства навек.
Ты званочкам не бразгай:
Ты не той чалавек.
**Вядучы 1.**... Сумленне і справядлівасць
Мы адновім
Навечна.
Мы зробім сваю зямлю
Зямлёй сапраўдных майстроў,
Самай праўдзівай
І чалавечнай.

**Старонка 2.**
**«ПРА ТЫХ, КАГО ЛЮБЛЮ».**

*Каму прысвечаны гэтыя радкі Пімена Панчанкі:*
Ты прыйшоў з вайны і гора,
Ты з малітвы,
Ты з разгневанага бору,
Ты смалісты.
Сто паэтаў цягнуць хорам,
Ты салістам.
Ты нібы святло ў лесе
Ад каліны,
Ты ад самай добрай песні —
Ад Куліны.
(Рыгору Барадуліну)
*Чыё яшчэ імя ўзгадвае паэту вершы «Трое»:*
Паміж эпох

Невыразных і шэрых
Сярод пакутнікаў і герояў
У Беларусі было найвялікшых
трое:
Каліноўскі,
Купала...

(Машэраў)

*Памяці якога свайго сябра прысвяціў Панчанка гэтыя радкі:*

Прыціхнуў боль,
Адна туга тупая...
Не пазваніць табе,
Не адшукаць...
Як шчырасці тваёй
мне не хапае,
Як не хапае мне цябе, Аркадзь.

(Куляшова)

*У вершы «Беларускі верлібр» аўтар прыгадвае некалькі дарагіх для беларускага сэрца людзей, перад якімі нам павінна быць сорамна. Назавіце імёны гэтых асобаў.*

Беларуская дзяўчынка з Зембіна
Заляцела ў Парыж,
Зрабілася вядомай мастачкай,
Выйшла замуж
За славутага Фернана Лежэ.
Часта ўспамінала Беларусь...
Пад старасць падарыла Зембіну
Многа сваіх карцін.
Іх, каб лепш зберагчы,
Мясцовыя ўлады так схавалі,
Што ледзь-ледзь знайшлі.

(Надзя Хадасевіч)

Яшчэ больш ганебная гісторыя адбылася з работамі другога нашага сусветна вядомага суайчынніка, які перад смерцю захацеў падарыць роднаму гораду «некалькі дзесяткаў сваіх карцін».

Мясцовыя кіраўнікі
Пры актыўнай падтрымцы
Саюза мастакоў Беларусі
Сказалі:
«Нам не нужны модернисты»...

*Панчанка заўважае, што мастак «пакрыўдзіўся і памёр». Толькі праз даволі працяглы час, ужо пасля смерці мастака, сітуацыя змянілася. Пра каго ўзгадвае Панчанка?*

(пра Марка Шагала)

Сярод прыкладаў Панчанкі есць і такі: Адзін буйны паэт хацеў

Прачытаць у Мінску лекцыю
Пра дзіўныя казкі, легенды і песні
Беларускага народа,
З якіх ён чэрпаў поўнымі жменямі
Жывую ваду
Дпя сваіх вершаў, балад і паэм...

*Лекцыя была забаронена, і ў выніку «шмат ашаламляльных, хвалюючых лекцый» былі прачытаны, але адбылося гэта ў Сарбоне. Хто гэты дзеяч?*

(Адам Міцкевіч)

## Старонка 3.
## «ПАЭЗІІ СВЯТОЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ».

**Вядучы 1.**Жыццё маё, ты — як цягнік бясконцы:
Святло і цень,
То змрок, то светласць рос,
І людзі з-за мільгаючых аконцаў
Не бачаць ні пакут маіх, ні слёз.
**Вядучы 2.**Не здамся!
Бяссоннаю працай спалю
Сябе, ды ад праўды не адступлюся.
І словам я сцверджу ўсё, што люблю
У народзе сваім і сваёй Беларусі.
**Вядучы 1.**Паэзія — гэта пакута і радасць,
Праклён і бязлітаснасць, споведзь і годнасць,
Вогненны сцяг над барыкадай,
Цішыня травы і рыканне горада;
Гэта вар'яцтва і гэта мудрасць,
Розум і ачышчэнне;
Плаванне ў рэках бурлівых і мутных
І зоркі далёкай свячэнне.
**Вядучы 2.**Гэта чаканне каханай дзяўчыны
Сцюжы і здрадзе наперакор;
Гэта душы найвышэйшая шчырасць
І задыханне, разрэджанасць гор;
Гэта трывога за касманаўта
І ручаіны жаночых рук;
Чыстая, з самага донца праўда,
Сэрца дзіцячага здзіўлены стук...
**Вядучы 1.**Народ — пясняр, народ — паэт.
Народ без паэзіі? Недарэчнасць.
Паэзія — самы няўлоўны сакрэт,
Які не будзе нікім рассакрэчаны.
**Вядучы 2.**Мала вар’яцтва ў нашай паэзіі,
Мала фантазіі.
Прэсна і посна.

А хто цяпер на ражон палезе?
За Маякоўскімісці, кажуць, позна.
Хто цяпер выскачыць з рэбраў уласных
І паспрачацца адважыцца з Богам?
Сёння жывуць практычна і ясна,
Кажуць, цяпер такая эпоха.
Усё разлічана і падлічана,
Змадэліравана,
Запраграміравана.
А я не хачу, каб усё па палічках,
А я не хачу, каб ціха і мірна.

**Старонка 4.**
**«АБАРОНЦА РОДНАЙ МОВЫ».**

**Вядучы 1.**А за апошнія
Трыццаць гадоў
Шмат на жыцці нашым
Чорных слядоў:
Шмат беларускіх
Настаўнікаў школ
Загнаў у магілу
Чыноўніцкі кол.
Глынулі ў нас мову,
Абрады, культуру.
А літаратуру —
У макулатуру.
У тых чорных дзірках
Па-варварску рады
Мовы забойцы
І бюракраты.
**Вядучы 2.**Кажуць, мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.
Гэта ластавак шчабятанне,
Звон світальны палескіх крыніц,
Сінь чабору, і барвы зарніц,
І буслінае клекатанне.
**Вядучы 1.**Пастаю я самотна
Каля полацкай белай Сафіі,
Паблукаю ў Гародні,
Пажуруся ў турава-пінскім Палессі,
А вочы мае ўжо не плачуць —
Сухія-сухія:
Не чутно мне з былога

Ні грому,
Ні звону,
Адны толькі казкі
Ды песні...
Родны Янка Купала,
Вы пісалі:
«Я веру — настане...»
Дарагі мой Іван Дамінікавіч,
Не, не настане!
Гэта ўжо не світанне,
Гэта наша настала змярканне,
Гэта з мовай маёй,
Гэта з песняй маёй
Развітанне.
**Вядучы 2.**Ільняная і жытнёвая. Сялянская.
Баравая ў казачнай красе.
Старажытная. Ты самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.
Вобразная, вольная, пявучая,
Мова беларуская мая!
Дратавалі, здзекваліся, мучылі...
Ты жыла і ў працы і ў баях.
Пра цябе, як сонечнае дзіва,
І Купала, ды іўсе мы снілі сны...
Ад цябе, ласкавай і праўдзівай,
Адракаюцца цяпер твае сыны.
**Вядучы 1.**Пра народ мой церпялівы, працавіты
Помняць партызанскія лясы...
Хто за намі? Пакаленне прагавітых.
Халуёў я чую галасы.
Я спяваў пра жыта і пра жаўранкаў
Ненавідзеў акупантаў і прыгнёт,
А сягоння — велікадзяржаўнікаў
Што разбэсцілі вялікі мой народ.
Навучылі не рабіць —
Хлусіць і красці.
Дзеці ў школы з іншай моваю бягуць.
Я хацеў нашчадкі, вас праклясці,
Ды люблю сваю зямлю... і не магу.
**Вядучы 2.**І я на «клюкву» «журавіны»
Не прамяняю, не аддам.
І светлы край наш жураўліны
Я дзецям ціха перадам.
*Гучыць беларуская мелодыя, якая павольна робіцца грамчэй.*

## “ПАЭТЫЧНАЯ СПОВЕДЗЬ СУМЛЕННЯ”

*Вечар паэзіі да юбілею з дня нараджэння Пімена Панчанкі*

*Зала афармлена кніжнай выставай “Незгаслая зорка паэзіі”.*

Цытаты, прысвечаныя асобе і творчасці паэта:

“Пімен Панчанка дае вострае, жывое адчуванне сучаснасці, якое ў спалучэні з выдатным майстэрствам, дае нам паэзію высокага класа, паэзію народную, жывучую”.

“Паэзія Панчанкі народная. У гэтым, бадай, галоўная вартасць яго вершаў”.

(Міхаіл Святлоў).

“Ведаю, як Панчанку няспіцца...
Ён і нам аціхнуць не дае.
Ён, паэт, ніколі не даруе
Нам радок, што сэрца халадзей”

(С. Панізнік верш "Над кнігай П. Панчанкі")

Цягне ён, як добры трактар, -
Дыпламат, паэт, рэдактар.

(сяброўская эпіграма).

*Кніжная выстаўка “Нязгаслая зорка паэзіі”*

*1 раздзел "Беларусь, я твой воін адданы і сын..."*

Веру цвёрда: сканае бязлітасны вораг,
Ў штандар перамогі над краем запаліць зару.
Пакуль сонца не згасне,
Пакуль свецяцца зоры,
Беларусь не загіне, будзе жыць Беларусь

(П. Панчанка “Беларусі”)

*2 раздзел “Пакіньце мне мову маю...”*

(вершы 1950-1960гг.)

“Для мяне яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара,
Гэта ластавак шчабятанне,
Звон світальны палескіх крыніц,
Сінь чабору, і барвы зарніц,
І буслінае клекатанне”

(П. Панчанка “Родная мова”)

*3 раздзел “Людзі, людзі, жывіце нармальна...”*

Толькі б захаваць
Усё найлепшае,
Толькі б пахаваць

Усё найгоршае.
Бо без чалавечнасці
Не будзе і вечнасці

(П. Панчанка)

*4 раздзел "Вось ён, свет, як сэрца, непадробны..."*
(пранікнёны паэт-лірык)
"Росная, зялёная айчына!
На цябе, паўнюткую святла"
Пазіраюць круглымі вачыма
Птушаняты з цёплага дупла"

(П. Панчанка "Дождж ідзе...")

*Вечар паэзіі пачынаецца песняй "Бацькаўшчына" (сл. У. Караткевіча, муз. Л.Мурашкі), або "Спадчына" (сл. Я. Купалы. муз. І. Лучанка). Магнітафонны запіс,ці выканаўцы вакальнай групы Дома творчасці юных.*

**Вяд.1.** Любімы паэт. Сустрэча з ім самім і яго творамі зараз адбудзецца. Сёння ўвесь вечар з намі будзе паэзія Пімена Панчанкі.

**Вяд.2.** 2007 год - юбілейны ў беларускай паэзіі. Мы святкуем 90 - годдзе Пімена Емельянавіча Панчанкі.

Творчае крэда вялікага паэта Беларусі Пімена Панчанкі было вызначана ім яшчэ ў 1961 годзе. У дзённіке паэта з'явіўся такі кароткі і ёмкі запіс: "Паэзія- споведзь веку, прапушчаная праз уласнае сэрца".

***Чытальнік***
"Паэзія - гэта пакута і радасць,
Праклён і бязлітаснасць, споведзь і гордасць,
Вогненны сцяг над барыкадай
Цішыня, травы і рыканне горада;
Гэта вар'ятства і гэта мудрасць,
Розум і ачышчэнне;
Плаванне у рэках бурлівых і мутных
І зоркі далёкай свячэнне.
Вера ў шчасце, з няпраўдай змаганне,
Чорнае неба і сонца ў расе;
Гэта спрадвечныя нашы пытанні,
Гэта адказы, ды толькі не ўсе...

(П. Панчанка "Паэзія")

**Вяд.1.** Год нараджэння паэта (1917) супаў з годам бурных рэвалюцыйных падзей. Спачатку Талін, куды бацькі, беззямельныя сяляне, выехалі ў пошуках заробку. Пасля рэвалюцыі сям'я вярнулася на Беларусь. Тут, сярод маляўнічай прыроды, сярод разумных і працавітых сялян, ён знайшоў, убачыў, пачуў усё, што якраз і патрэбна было будучаму паэту.

***Чытальнік:***
Многае з мінулага нясучы,
Я да скону ў сэрцы зберагу
Вёску на Бабруйчшыне, Казулічы –

Маладосць маю,
Маю тугу.
Там чытаў я школьнікам Купалу,
Сам пісаўя нешта аб вясне...
Вёска тая
У полымі сканала,
Крык апошні знік у чорным сне

(П. Панчанка)

**Вяд.2.** Першая спроба пяра аказалася шчаслівай, што і вырашыла яго лёс. Духоўнаму ўздыму спрыяла творчасць Я. Купалы, А. Пушкіна, Я. Коласа У. Маякоўскага, Э. Багрыцкага.

У 1934 годзе пад псеўданімам - Алесь Загорны, з'явіліся першыя вершы “Ураджайнае” і “Моладзі”.

***Чытальнік:***

Нашы бурныя дні начаку,
Развінайся ж у маршы, моладзь,
Як сяброўку, вітай за руку
Маладую вясну камсамола.
Дык заўсёды ж ты будзь начаку,
Развінайся у маршы моладзь,
Як сяброўку, вітай за руку
Маладую вясну камсамола.

( П. Панчанка "Моладзі")

**Вяд. 1.** Першыя сборнікі варшаў паэта “Упэўненасць” (І938г), “Вераснёвыя сцягі” (1940 г) прасякнуты тыповым настроем і адчуваннямі тагачаснага маладога пакалення - радасць, упэўненасць, рамантычная вера ў шчасце, любоў да радзімы.

***Чытальнік:***

“Я малым хлапчуком палюбіў тваe пушчы і нівы,
І блакітныя рэкі, і мора зялёных лугоў.
Ты мяне гадавала, як маці, і рос я шчаслівы,
Не зазнаўшы галечы, з атрадам вясёлых сяброў.
О, Радзіма, табою напоўнена сэрца да краю,
І заўжды - ці працую, ці пільна на варце стаю, -
Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю
І люблю, як жыццё, я зямлю маладую тваю!”

( П. Панчанка “Радзіма”)

**Вяд. 2.** У гады вайны муза паэта апранула ваенны шынэль. 3 успамінаў П. Панчанкі: “Вайна застала мяне ў Беластоку. Адтуль адступаў на Магілёў. Машыны рэдакцыі нашай газеты былі разбіты і давялося пехатой прайсці многія дзесяткі кіламетраў...” Ваенным карэспандэнтам прайшоў Панчанка дарогі чатырох франтоў - Заходняга, Бранскага, Калінінскага, Паўднёва-Заходняга.

У шматлікіх творах ваеннага часу паэт прысягае роднаму краю ў сыноўняй зернасці, яго радкі прасякнуты непахіснай верай у перамогу над ворагам.

***Чытальнік:***

Мой родны край, паслухай слова сына,
У горкі час зямлю сваю агледзь,
Шляхі, шляхі, разліў азёраў сініх,
Высокіх сосен вылітую медзь;
Нягоднікі! Нахлынулі з разбоем,
Прымежны гай абвугліўся, счарнеў...
Смерць ворагам!
Склікае нас да бою
Народны гнеў, вялікі мужны гнеў.
Каб вораг задушыўся едкім дымам
І загаіць не змог смяротных ран, -
Змагайцеся адважна за Радзіму,
Атрады беларускіх партызан!

(П. Панчанка “Змагайцеся адважна за Радзіму!”)

**Вяд.1.** Па меркаванню літаратураў адным з самых лепшых вершаў не толькі ў беларускай, але і ва ўсёй савецкай паэзіі ваеннай пары з'яўляецца верш Панчанкі “Сінія касачы”. Яшчэ нядаўна, ціхай і роснай чэрвеньскай раніцай сінія касачы глядзелі паэту ў вочы сваёй нерастрачанай красой, а цяпер прыніклі, здратаваныя бруднымі ботамі прышэльцаў. Гэтыя кветкі паэт узяў сімвалам хараства і чысціні таго жыцця, якім не паспеў нацешыцца ў сваёй мірнай малодосці.

***Чытальнік:***

А калісці і я прачынаўся ў бацькавай хаце
Чэрвень. Раніца. Росы і цішыня.
На гародзе спявае паціху маці
Пра маладога жаўнера, гнядога каня.
А пад вокнамі мята п'е сонца гарачае,
І глядзяць мне у вочы красой нерастрачанай
Сінія касачы
**************************************
Не паспелі ў шчасці як след пакупаца мы,-
Бомбы свіснулі, пырскнула першая кроў.
Хата вочы закрыла дашчанымі пальцамі;
Каб не бачыць гора гаспадароў.
Прашаптала матуля на ростані: "Лёс такі!.."
І прыніклі журботна да градак пялёсткамі
Сінія касачы
Пяць франтоў мяне пылам гарачым абсыпалі,
За вайну перамерана тысячы вёрст.
З успамінамі крочыў пад ветрамі сіплымі

І з надзеяй на студзеньскім холадзе мёрз.
І заўсёды здалёк, праз прасторы вялікія
Усміхаліся мне і дамоў мяне клікалі
Сінія касачы.
Нехта бруднымі ботамі, пэўна іх вытаптаў,
Выбіў градкі, спаліў невысокі паркан.
І не мае аздобы зямля працаеітая,
І сумуе па кветкам маўклівы туман.
Прыйдзе час - зноў збудуем мы хаты ўтульныя,
А цяпер - біць дык біць! І за слёзы матуліны,
І за сінія касачы.

( П. Панчанка "Сінія касачы" 1942 г)

**Вяд.2.** Зборнікі "Дарога вайны" (1943г) і "Далёкія станцыі" (1945 г) - гэта балючая споведзь паэта пра зведанае, перажытое ў віхуры крывавага і грознага ліхалецця.

У вершы "Кожны з нас прыпасае Радзімы куток" сэрца салдата, які вырваўся з варожага акружэння і апынуўся ля роднай хаты, перапоўнена пачуццямі.

***Чытальнік:***

"Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,
Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны –
Дым над хатай, снапамі прыціснуты ток,
Матчын спеў і гароды, прапахлыя кмінам...
Гэта быў сорок першы палаючы год.
Прабіраліся мы з акружэння на ўсход.
У аршанскіх лясах на адной з дарог
Я пазнаў сярод верасу след маіх ног.
І паклікала родная хата мяне.
Я падпоўз да сяла, калі гаснулі зоркі,
Расхінуў асцярожна кусты і знямеў –
Каміны...каміны...Дух пажарышча горкі.
Наліваліся кветкі сцюдзёнай расой,
І прамыла раса мае сумныя вочы,
Каб убачыў я ўсё, каб запомніў усё,
Каб я думаў пра помсту і ўдзень, і ўночы.

(П. Панчанка "Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...")

**Вяд. 1.** Тэма вайны не пакідала паэта на працягу ўсяго творчага шляху. У розныя гады ім напісана шмат моцных па сіле эмацыйнага ўздзеяння вершаў, дзе падкрэсліваецца антыгуманная сутнасць вайны.

***Чытальнік:***

"Я столькі бачыў агню,
Я столькі бачыў пажараў,
Што часам пра цішыню
Неяк збянтэжана мару.

Толькі агонь шугане,
Толькі мы чаркі напоўнім,
Зноў аб вайне, аб вайне
Абавязкова ўспомнім.
Усе мы ў баях гартаваліся,
І не забыць нам страт.
Многія не дачакаліся
Ні цішыні, ні кастра”.

( П. Панчанка “Агонь”)

**Вяд.2.** У 1944 годзе П. Панчанка ў якасці ваеннага карэспандэнта апынуўся за межамі Радзімы - у далёкім Іране. У гэты перыяд быў створаны вельмі адметны і цікавы цыкл вершаў “Іранскі дзённік”. Паэт здолеў перадаць экзотыку і хараство краявідаў паўднёвай краіны, яскрава паказаць народнае жыццё і побыт далёкага замежжа. Увесь час у думках і снах, паэт згадвае вобраз роднай зямлі.

***Чытальнік:***

“Дарога бегла у Бендер-Шах,
Сцякала з гор да нізін.
Матор клекатаў у маіх вушах
Запар шэсцьсот хвілін.
Ад цішыні я раптам аглух
І выйшаў, як п'яны, на луг.
Насустрач выбеглі кіпарысы:
“Ад нашага сонца, таварыш, прыкрыйся”.
І раптам, расштурхваючы натоўп
Крыклівых паўднёвых дрэў,
Бяроза рынулася:
“Браток,
Як слаўна, што ўрэшцы мяне ты сустрэў!”
Мы доўга з бярозай стаялі ўдваіх
На нейкай нізіне, ў далёкім Іране,
На поўнач з бярозай глядзелі ўдваіх
І так размаўлялі, што горы і луг
Ад рэўнасці дзікай ў тузе заміралі.

( П. Панчанка “Сустрэча з бярозай”)

**Вяд.1.** Яго герой успрымае экзотыку чужой краіны вачыма і душой беларуса, які моцна трымаецца свайго роднага свету. Цыкл "Іранскі дзённік" прасякнуты моцнымі настальгічнымі пачуццямі. Герой паэта адчувае сябе на чужой зямлі падарожнікам.

Прачытайце вершы: “Караван”, “Дождж”, “У Тэгеране”, “Я ўсё пераблытаў...”, “Бутэлька цынандалі” і пагадзіцеся з нашай думкай.

Пік у творчасці П. Панчанкі прыпадае на другую палову 50-х і 60-я гады 20 стагоддзя. У гэты час чытач чустрэўся з такімі яго кнігамі “Кніга вандраванняў і любові” (1959 г), “Нью-Йоркскія маланкі” (1960 г), “Тысячы

небасхілаў” (1966 г) і іншыя. Ярка і выразна у гэтых творах адлюстроўваецца грамадскае жыццё, сацыяльныя праблемы, пошукі шчасця і хараства быцця. За гэтыя гады паэт аб'ехаў амаль цэлы свет, пабываў у самых розных кутках планеты, і заўсёды ён адчуваў сябе пасланцам свайго народа і Радзімы.

***Чытальнік:***

“Даруй, Радзіма, ды ў сваім жыцці
Сябе тваёй галінкай адчуваю,
Якой на іншым дрэве не расці.
І па якіх дарогах ні паеду,
І па якіх марах ні паплыву,
І дзе ні прыпынюся, - маці, ведай:
Тваім жыццём, табой адной жыву”.

**Вяд.2.** Гэта ўрывак з паэмы “Патрыятычная песня”, за якую аўтар у 1959 годзе атрымаў Літаратурную прэмію імя Я. Купалы.

Новы ўздым у творчёсці паэта звязаны з так званай хрушчоўскай адлігай. Паэт працаваў напружана, адзін за адным выходзілі яго зборнікі. Трывога за Беларусь, за лёс народа і яго культуры сталі вызначальнымі ў зборніку “Пры святле маланак” - і зноў атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы ў 1968 г. Паказальны тут верш “Родная мова”, напісанню якога паслужылі наступныя падзеі. У той перыяд партыйная кіраўніцтва СССР паставіла задачу ліквідаваць усе нацыянальныя адрозненні народаў, якія ўваходзілі ў склад савецкай імперыі. А першый наступ быў зроблены на мову. Пісьменнікі пратэставалі супраць русіфікацыі нашай рэспублікі. Сярод іх - Пімен Панчанка. Найбольш яскрава яго пазіцыя выявілася ў вершы “Родная мова”.

*Фонам гучыць мелодыя песні “Бераг Айчыны”(сл. Э. Агняцвет муэ. А. Арэхава)*

***Чытальнік:***

Кажуць, мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй знікнуцць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.
Калі ж хто загадае: “Не трэба!”-
Адрачэцца ад мовы народ,-
Папрашу я і сонца, і неба:
Мне не трэба ні славы, ні хлеба,
Асудзіце на безліч нягод.
Ці плачу я, ці пяю,
Ці размаўляю з матуляю –
Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

(П. Панчанка “Родная мова”)

**Вяд.1.** Паэт актыўна рэагаваў на самыя нязначныя змены ў грамадскім жыцці, з'яўляўся своеасаблівым барометрам духоўнай атмасферы сваёй эпохі. Многія яго вершы пераждылі свой час.

Творчасць 70-80 гадоў адлюстроўвае тагачасны лад жыцця грамадства застойна - застольны. Паэт гнеўна бічуе і мае правы на ўдар па пошласці подласці сярод “хітрых прыстасаванцаў”, “малавераў”, “скептыкаў”, “ныцікаў” і іншых.

***Чытальнік:***

Пачаўся перапіс грахоў:
Іх як калосся ў жыце...
Усе грахі сваіх сяброў,
Суседзяў, саслужыўцаў,
Дзяцей малых,
Бацькоў старых,
Буфетчыц на вакзале
І падначаленых сваіх –
З прыемнасцю назвалі.
Той хабару начальству даў,
Той пажывіўся ў касе,
Той спякульнуў,
Той недадаў,
Той “Жыгулі” свае прадаў
Выгодна на Каўказе.
О, выкрываццелі грахоў,
Цаню я вашу смеласць!
Тут мала ўжо прамоў,
Вымоў:
Здымаць пара наспела.
Я рукавы ўжо закасаў,
Ды стала мне нядобра;
Ніхто, ніхто не запісаў
Свой грэх, хоць самы дробны.

(П. Панчанка “Перапіс грахоў”)

**Вяд. 2.** Пімен Панчанка - паэт, моцна ўлюбёны ў прыроду роднага краю, у бацькаўскую зямлю. Таму ён і палкі абаронца маці-прыроды. У вершах экалагічнай тэматыкі “Лясы і рэкі”, “Ветрана і золка...”, “Мы пільней пазіраем на рэкі...” і іншых мастак слова занепакоена гаворыць пра тое, як спустошваецца навакольны свет, і заклікае людзей адумацца і спыніць варварства людзей у адзіным доме.

***Чытальнік:***

“На Брэстчыне карыбскі ураган,
Паводка бангладэшская увосень.
Дажджы зімой.
Снягоў няма.

Туман.
На бронетранспарцёрах сена звозім.
Калі б тут не сапраўдная бяда,
Дык можна б пастаяць і падзівіцца.
Але вада,
Страшэнная вада,
Нялёгка часам да людзей прабіцца.
Жывой вады руйнуючы удар,
Мы зубы сцялі, не клянём нікога
Плывуць сцягі па небу паміж хмар
і не знаходзяць сонца залатога.
Дае прырода зноў урокі нам:
Не верце цішыні, салодкім снам,
Бяда і радасць ходзяць побач вечна,
Людзей ратуе толькі чалавечнасць.”

(П. Панчанка “На Брэстчыне карыбскі ураган...”)

**Вяд.1.** У асобе П. Панчанкі было не цесна і сельскаму настаўніку, і сталічнаму паэту, працаўніку, чалавеку кампанейскаму, які шчыра траціў час на вясёлыя сяброўскія сустрэчы.

П. Панчанка вёў асабістыя дзённікі і ўжо будучы мастытым, прызнаным паэтам часта сярод сяброў паэтаў успамінаў смешныя і цікавыя моманты жыцця.

Непаседа - вандроўнік, П. Панчанка кожны раз весела ўспамінаў кругасветны круіз на параходзе. Яго спадарожнікі потым напамяць чыталі яго экспромты, складзеныя на афрыканскіх берагах: “Баабаб, баабаб, я ахвоч да чорных баб”.

Яшчэ паэт расказваў, як будучы ў Англіі смела гутарыў з лордам. Прагульваючыся ўздоуж сцяны квітнеючых руж, англічанін сказаў яму:

“Nice!” і Пімен Емельянавіч таксама галосна адказаў: “Nice!” Субяседнікі раскланяліся і разышліся, задаволеныя сабой. Дарэчы слова “Nice!” з англійскай мовы пераводзіцца (Хорошо, отлично).

**Вяд.2** Інтымная лірыка Пімена Панчанкі створана ў рамантычна-сентыментальным стылі. Ад яе вее цеплынёй, яна ўзносіць чытача на вершыню пяшчотных пачуццяў.

*Фонам гучыць песня “Ты мне вясною прыснілася” (сл. М.Шушкевіча муз. Ю.Семянякі)*

Паслухайце верш “Пры святле маланак”.

***Чытальнік:***

“Вясне так хочацца прысесці
На сакавітую траву:
Каштанаў факельнае шэсце
Ёй закружыла галаву.
З вясной мы ў лівневым палоне,
Ў чужым пад'ездзе я стаю.

Прыкрыў манашаскай балонняй
Тут хлопец дзеўчыну сваю.
Пакуль гарачы лівень шастаў
Для гэтых я не існаваў.
Я каля іх на ўскрайку шчасця
З трывожнай думкаю стаяў.
Свет для іх тварыўся нанова,
Пачалася эпоха цудаў:
Сэрцы прагнулі сініх маланак,
Сусны сохлі ад спелай смагі”

( П.Панчанка “Пры святле маланак”)

**Вяд.1** Галоўная якасць паэзіі Пімена Панчанкі гэта чалавечнасць. У творчасці паэта задача: дапамагчы чалавеку ўбачыць і зразумець прыгожае і светлае ў жыцці, у людзях, у самім сабе, падтрымать гэта прыгожае і светлае, усяліць у чалавека веру ў перамогу дабра над злом, праўды над няпраўдай.

**Вяд.2** Паэзія П. Панчанкі апошніх гадоў жыцця - змаганне праз вастрыню слова і з'едлівасць сатырычнага высмейвання.

Паэту баліць за сучаснае пакаленне, якое гіне. Не прывучаныя ні працаваць і эканоміць, маладыя чэзнуць ад п'янства, блуду, “грому маскультуры”. І няма каму пабедаваць аб дзецях, бо і самі дарослыя удосталь наглыталіся хлусні, пустаслоўя, застаўшыся з сваімі “драўлянымі” рублямі каля разбітага карыта. А хто ў гэтым вінаваты? Адказ шукайце ў вершах: “Кабінеты”, “Труба”, “Паразіты”, “Не адцураюся, не не адракуся”, “Персанальныя шафёры”, “Паэма сораму і гневу”.

***Чытальнік:***

“Вечна не хапае нам шафёраў,
Трактарыстаў і будаўнікоў.
А кармы ці гной развозіць - гора:
Бо не навучыўся ў бацькоў.
А размах той шоферагадоўлі –
Легкавухі пруць з усіх бакоў!
Трэба нам шафёры на будоўлях,
А яны развозяць жарабкоў.
Так шафёр начальніка панее:
Паганяў бензінавы дымок,
Нахапаў “Кліентаў” на панелі,
Тры гады - машына і дамок.
Не чапай шафёрскую ты касту:
Раз начальнік - трэба і шафёр.
Ды замоўкні - ты, крыкун клыкасты,-
Нейчых жонак чую злосны хор.
Хлопцы, ў персанальныя не прыце!
Папрацуйце – і дастаток прыйдзе.
Вы дзяржпланы, штаты ўсе папраўце,

Каб жылося ўсюды ў нас папраўдзе.

(П. Панчанка “Персанальныя шафёры”)

**Вяд.1** Амаль два з паловай гады не дажыў Пімен Емельянавіч да свайго 80-гадавога юбілею. 2 красавіка 1995 года ён пакінуў гэты свет. Народны паэт Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій Беларусі і былога Саюза, ганаровы акадэмік АН Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Совета рэспублікі- усё гэта Пімен Панчанка.

Паэтычная спадчына П. Панчанкі - праўдзівая энцыкпапедыя нашага духоўнага жыцця, люстэрка, у якім мы бачым і пазнаём сябе. А наступныя радкі сведчаць аб усей творчасці вялікага паэта.

***Чытальнік:***

Новае творыцца цяжка і доўга
З выпрабаванняў, з адвагі, з пакут.
Ні пастановы, ні планы, ні догмы
Нам уладальнікаў дум не спякуць.
Самаахвярнасць і міласэрнасць,
Праца да стомы,
З няпраўдаю бой
І справядлівасць паселяцца ў сэрцы
І павядуць па жыцці за сабой

(П. Панчанка “Зямля у мяне адна”)

**Вяд.2** Завершыць знаёмства з творчасцю П. Панчанкі хочацца жартоўнай фразаю паэта Міхаіла Святлова, які у суровыя гады вайны пытаў у свайго лепшага сябра: “Што ў Пімене табе маім?”, а такое пытанне было навеяна славутым пушкінскім вершам.

Мы можам смела адказаць: гэта імя - цэлы свет беларускай паэзіі.

# «Ад літаратурных радкоў – да сэрцаў чытачоў»

Зборнік сцэнарных матэрыялаў да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў 2017 года

Склад. : А. М. Міхейкіна-Белякова

ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
225306, г. Кобрын, вул. Жукава, 12
8(016 42) 2 36 81
E-mail: kobrinlib@gmail.com